Привязывали к столбу и зверски истязали за то, что военнопленный, истощенный голодом, не мог подняться и пойти на работу. Избивали за то, что военнопленный хотел скушать вторую порцию баланды и за другие повинности. Бывший военнопленный Шумский С.Ф. сообщал: «...Многие из военнопленных были до такой степени истощены и измучены, что не в состоянии были выйти по естественным надобностям, оправлялись под себя. Как только об этом

узнавали полицейские, виновника привязывали к столбу, а к лицу подвешивали банку с его испражнениями. Так он должен был простоять 12 часов, а иногда и больше. Причем полицейские наносили удары палкой, другие резиновой плеткой или же проволокой. Многие, и без того потерявшие всякие силы, не выдерживали и умирали [9, л. 126].

Советских людей избивали, им наносили ножевые ранения только за то, что они не приветствовали немцев. Так, пострадавший Голышенко К.М. рассказал: «... Розен (комендант лагеря) запомнился в моей памяти тем, что он зверски относился к военнопленным. Избивал резиновой палкой и даже наносил ножевые ранения пленным лишь только за то, что его не приветствовали...» [10, л. 197].

Вся система гитлеровских лагерей для советских военнопленных была рассчитана на их быстрое, а главное – тотальное уничтожение. Режим в этих лагерях по своей жестокости почти не отличался от режима, существовавшего в концлагерях, хотя по международному праву военный плен – это не преступление. Режим в лагерях для военнопленных в отличие от концентрационных лагерей характеризовался следующими особенностями:

1. Охрану лагерей для военнопленных несли войска вермахта.
2. Внутреннее управление и надзор военнопленных осуществляли полицейские из числа самих военнопленных.
3. Военнопленные находились в военной форме, в которой они попали в плен, а не в полосатых арестантских костюмах.
4. За политическим настроением военнопленных вели наблюдение офицеры армейской контрразведки и по согласованию с командующим вермахта их контролировали органы гестапо. Тех военнопленных, которых считали наиболее опасными в политическом отношении, либо уничтожали сразу же после выявления, либо направляли в концентрационные лагеря.


1. Шарков, А.В. Правовое регулирование военного плена в годы Второй мировой войны и послевоенный период / А.В. Шарков // Другая сусветная вайна: новыя аспекты даследаванняў / Адк. рэд. В.Ф. Балакіраў, К.І. Козак. – Мінск, НАРБ, 2004.
2. Попов, Ю.Н. Исторический анализ правового положения военнопленных в годы Первой и Второй мировых войн / Ю.Н. Попов // «Война и плен. Мартиролог» – Минск: Юнипак, 2005.
3. НАРБ, ф. 1440. – Оп. 3. – Д. 952.
4. Саваняка, М.Я. Прававыя асновы ваеннага палону напярэдадні і ў гады Другой сусветнай вайны / М.Я. Саваняка // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 4.
5. НАРБ, ф. 1363. – Оп. 1. – Д. 2849.
6. НАРБ, ф. 1363. – Оп. 1. – Д. 2849.
7. НАРБ, ф. 1363. – Оп. 1. – Д. 2849.

8. НАРБ, ф. 1363. – Оп. 1. – Д. 2849.
9. НАРБ, ф. 1363. – Оп. 1. – Д. 2849.
10. НАРБ, ф. 1363. – Оп. 1. – Д. 2849.

А.І. КОРСАК

## ВЫРАШЭННЕ "ЯЎРЭЙСКАГА ПЫТАННЯ" НА ТЭРЫТОРЫІ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АКРУГІ "ЛІТВА" НА ПРЫКЛАДЗЕ ВІДЗАЎСКАГА ГЕТА

Відзы на сённяшні дзень – гэта невялікі пасёлак гарадскога тыпу, які знаходзіцца ў паўночна-заходняй частцы Віцебскай вобласці з 2-тысячнай колькасцю пражываючага насельніцтва, сярод якога асоб яўрэйскай нацыянальнасці амаль няма.

Яшчэ да пачатку ваенных дзеянняў супраць СССР нацысты распрацавалі план адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу акупіраваных у будучым зямель, рэалізацыя якога з некаторымі змяненнямі адбылася восенню 1941 г. Так, тэрыторыя з улікам нацыянальнасці насельніцтва і ў прыблізным суаднясенні з межамі дзеянняў груп армій дзялілася спачатку на рэйхскамісарыяты: "Украіна" на чале з Э. Кохам і "Остланд", якім кіраваў Г. Лозе. Рэйхскамісарыяты складаліся з генеральных акруг: "Беларусь", "Літва", "Валынь–Падолія", "Жытомір", тылавы раён групы армій "Цэнтр". Генеральныя акругі ў сваю чаргу падзяляліся на абласныя акругі (гебіты).

Што датычыцца паўночна-заходняй тэрыторыі сучаснай Віцебшчыны і Міншчыны, то частка Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў далучылі да генеральнай акругі "Літва" на чале з генеральным камісарам Андрыянам фон Рэнтэльнам [1, с. 204]. Такім чынам, па выніках адмініставцыйна-тэрытарыяльнага падзелу Відзы былі ўведзены ў склад Вільнюскага гебіта Швянчонскага уезда генеральнай акругі Літва.

Швянчоніс быў акупіраваны немцамі 27 чэрвеня 1941 г. Адразу былі ўстаноўлены нацысцкія органы акупацыйнай улады на тэрыторыі ўезда, кіраўніком якога быў прызначаны Міколас Кукутіс, бургамістрам горада–Вінцас Блажыс. На чале паліцыі ў 1941 г. стаяў маёр Пятрас Янушкавічус [2, с. 49].

Свае абавязкі мясцовае кіраўніцтва выконвала старанна, асабліва калі гэта датычылася яўрэйскага насельніцтва, жыццё і правы якіх абмяжоўваліся рознымі распараджэннямі акупацыйных улад. Так, камісар Вільнюскай акругі Х. Вульф 18 жніўня 1941 г. выдаў загад сваім падначаленным на месцах аб абавязаннасці яўрэяў насіць апазнавальныя знакі і пражываць у гета. На падставе дадзенага распараджэння М. Кукутіс 25 жніўня 1941 г. даводзіць да мясцовага яўрэйскага насельніцтва аб забароне набываць прадукты харчавання ў сялян на вуліцах і паблізу дарог, наведваць рынкі да 11 гадзін дня, дазвалялася купляць прадукты ў магазіне, але толькі ў прамежак часу з 17 да 18 гадзін [2, с. 52].

Трэба адзначыць, што гета на пачатак акупацыі тэрыторыі яшчэ не было створана – яўрэі працягвалі пражываць на сваіх старых месцах. Але былі знішчаны непатрэбныя, на погляд нацыстаў, элементы з ліку яўрэйскага насельніцтва, пакінулі толькі тых, хто меў пэўную працоўную кваліфікацыю і іх сем'і. Пра гэта сведчыць справаздача камандуючага аператыўнай каманды–3 аб вырашэнні яўрэйскага пытання ў Літве (чэрвень 1941 г.): "Я магу сёння сцвярджаць, што мэта вырашыць яўрэйскую праблему ў Літве выканана аператыўнай камандай 3. У Літве больш няма яўрэяў, акрамя тых, хто патрэбны для працы і іх сем'яў. Гэта: у Шаўляі 4500 чал., у Каўнасе 15000, у Вільнюсе 15000... Гэта яўрэі і іх сем'і ні ў якім разе не павінны быць расстраляны...(пер. аўтара.)" [3, с. 75].

У чэрвені 1941 г. нямецкія войскі ўступілі ў Відзы. Асаблівасцю населенага пункта было тое, што на яго тэрыторыі не адбывалася значных баёў. Галоўныя напрамкі наступлення вермахта мінулі яго.

У першы тыдзень акупацыі нацысты прыступілі да канчатковага вырашэння "яўрэйскага пытання" на рэгіянальным узроўні. Так, у раёне Відзаўскага возера было расстраляна каля 50 чалавек яўрэяў, у тым ліку дзеці, старыя і жанчыны. "Перад расстрэлам іх падверглі зверскім пыткам: жанчын і дзяўчат распранալі дагала, гвалтавалі і забівалі, а потым усіх загналі ў возера. Прычым частка яўрэяў патанула, а астатніх расстралялі на беразе возера" [4]. У тэкстах дзённіка дырэктара бібліятэкі Вільнюскага гета Германа Крука пададзена іншая лічба – 80 чал. [2, с. 69].

Восенню гэтага ж года было створана гета ў межах сучасных вуліц Пушкіна і Горкага г.п. Відзы, старастай прызначаны Л. Левін[1]. Умовы існавання былі невыноснымі, скіраваныя, у першую чаргу, на фізічнае знішчэнне праз голад, холад і распаўсюджанне розных інфекцыйных хвароб. Акрамя таго, вязні гета кожны дзень выконвалі свае працоўныя абавязкі перад акупацыйнымі ўладамі на патрэбы нацысцкай Германіі. Паводле ўспамінаў мясцовай жыхаркі В.М. Дзевянчуковай: "... мне было 9 год, калі немцы прыйшлі ў Відзы, у пасёлку яны стварылі гета, якое было агароджана дротам, знаходзілася ў Відзах за ракой. Памятаю, як зараз, у немцаў былі вялізныя плошчы памідор, а яўрэі іх палолі..."[2].

Вясной 1942 г. сярод вязняў распаўсюдзілася эпідэмія сыпнога тыфу. Вядома, што немцы баяліся розных інфекцыйных захворванняў, таму дзеля барацьбы з хваробай на тэрыторыю гета быў адпраўлены ўрач Х. Гінзбург. Згодна яго успамінаў пасля прыбыцця на тэрыторыю лагера: "... гета было агароджана высокім плотам, але аховы не было. Тэрыторыя лагера была вызвалена ад мясцовага беларускага і польскага насельніцтва. Выхад быў вольны. Так было да восені 1942 г. Сыпным тыфам захварэла чалавек каля 10, іх удалося ізаляваць..." [5].

---

[1] Запісана ў 2008 г. Корсак А.І. ад Адамовіч В.М. 1926 г.н., г.п. Відзы Браслаўскага раёна
[2] Запісана ў 2008 г. Корсак А.І. ад Дзевянчуковай В.М. 1932 г.н., г.п. Відзы Браслаўскага раёна

16 ліпеня 1942 г. Вільнюскі акруговы камісарыят інфармаваў Вільнюскую біржу працы, што ў Відзаўскім гета знаходзіцца 444 працаздольных яўрэя – 291 мужчына і 153 жанчыны. 6 жніўня 1942 г. Швянчонская біржа працы даводзіць да ведама Вільнюскай біржы працы, што ў Відзаўскім гета пражывае 1505 яўрэяў. Сярод іх 721 чал. – працаздольныя мужчыны і жанчыны. У той час на розных работах было занята 520 яўрэя гета, у 210 працаздольных вязняў гета не было працы [2, с. 69].

У канцы лета ў зоне беларуска-літоўскага памежжа была праведзена акцыя па ліквідацыі малых гета. Перад акцыяй акупацыйныя ўлады рабілі рэгістрацыю ўсіх працаздольных яўрэяў, каб ведаць, колькі яўрэяў можна пакінуць у жывых і колькі знішчыць непрацаздольных.

У пачатку лістапада 1942 г. у Відзы прыбылі паліцэйскія атрады украінцаў і літоўцаў. Афіцыйнай версіяй іх прыезда была арганізацыя экспедыцыі ў раёне Каз'янскага леса [5].

Паводле ўспамінаў відавочцаў: "... калі яўрэі даведаліся, што іх будуць страляць, яны прыходзілі да людзей хавацца. Хавалі і ў маёй сям'і яўрэйскага пастуха, ён ў нас прабыў два дні, а на трэці дзень, уночы, пастукалася яго радня і забрала. Былі і такія ў пасёлку, якія за гэта бралі грошы. Мы грошаў не бралі, як жа не пусціш, калі тыя падалі на калені. Людзі раней былі дружныя і не баяліся смерці, хоць і разумелі, што іх чакае за ўкрыццё яурэяў толькі смерць. Немцы то немцамі, але і былі мясцовыя бандыты, якія здекваліся з яўрэяў і рабавалі іх, але пра гэта даведаліся немцы і вывезлі бандытаў за могілкі. Доўга іх там мучалі, патрабавалі аддаць нарабаванае, а потым расстралялі"[3].

Наконт таго, калі было знішчана Відзаўскае гета , існуе рознагалоссе. У Расійскай яўрэйскай энцыклапедыі падаецца снежань 1942 г. [6]. У літоўскім выданні "Гетто Ошмянского, Свирского, Швянчонского уездов: списки узников" на падставе дадзеных Літоўскага дзяржаўнага цэнтральнага архіва наогул сказана, што "... восенню ўсе відзаўскія яўрэі (за выключэннем 72 чал.) былі пераведзены ў Швянчонскае гета. Затым 4 красавіка 1943 г. яны разам з астатнімі вязнямі былі вывезены ў Вільнюс і на наступны дзень расстраляны ў Панярай" [2, с. 69]. Тое, што нацысты пачалі акцыю па ліквідацыі гета ў Відзах восенню 1942 г., пацвярджаюць і ўспаміны мясцовых жыхароў: "... у саміх Відзах яўрэяў не расстрэльвалі, восенню іх вывезлі за пасёлак"[4]. Колькасць знішчанага яўрэйскага насельніцтва ў гета Відзаў падаецца ў 2708 чал. [4; 6]. З вышэй прыведзеных дадзеных можна меркаваць, што частка яўрэяў Відзаў была знішчана непасрэдна ў мястэчку, а частка (верагодна, працоўная) пераведзена спачатку ў Швянчонскае, а затым Вільнюскае гета, вязні якога часткова былі знішчаны ў 1943 г., астатнія пераведзены ў лагеры Эстоніі з наступнай ліквідацыяй у 1944 г. [7, с. 168–170]. Улічваючы тое, што згодна ўспамінам Х. Гінзбурга, украінскія і літоўскія атрады з'явіліся на тэрыторыі Відзаў у

[3] Запісана ў 2008 г. Корсак А.І. ад Дзевянчуковай В.М. 1932 г.н., г.п. Відзы Браслаўскага раёна
[4] Запісана ў 2008 г. Корсак А.І. ад Дзевянчуковай В.М. 1932 г.н., г.п. Відзы Браслаўскага раёна

лістападзе 1942 г., а на момант 22 лістапада гэтага ж года гета яшчэ існавала, то можна зрабіць вывад аб ліквідацыі часткі гета на памежжы лістапада–снежня, адсюль і ідзе розніца ў датах знішчэння відзаўскіх вязняў.

Такім чынам, гета ў Відзах праіснавала каля года – восень 1941 г.–восень – снежань 1942 г. Невялікі *тэрмін існавання быў характэрны для ўсіх* малакалькасных гета на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

1. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пастаўскага раёна. – Мн.: БЕЛТА, 2001. – 688 с.

2. Гетто Ошмянского, Свирского, Швянчёнского уездов: списки узников. – Вильнюс: Литовский государственный центральный архив, 2009. – 659 с.

3. Трагедия Литвы: 1941–1944 годы. Сборник архивных документов.– М.: Европа, 2006. – 400 с.

4. НАРБ. – Ф. 845. – Воп. 1. – Спр. 64. – Л. 3.

5. Ханоих Давидович Гинзбург. Видзы Браславский район. Режим доступа: http://shtetle.co.il/Shtetls/vidzy/vidzy.html.

6. Видзы // Российская Еврейская Энциклопедия. Режим доступа: http://rujen.ru/index.php.

7. Крысин, М.Ю. Прибалтийский фашизм. История и современность / М.Ю. Крысин. – М.: Вече, 2007. – 576 с.

А.М. ЛІТВІН

## ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА НАСЕЛЬНІЦТВА СТОЛІНШЧЫНЫ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: ДАКУМЕНТЫ І ЎСПАМІНЫ ОСТАРБАЙТЭРАЎ

Адной з недастаткова распрацаваных у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі тэм з'яўляецца тэма выкарыстання прымусовай працы насельніцтва Беларусі на карысць нацысцкай Германіі ў гады Другой сусветнай вайны. Па шэрагу прычын гісторыя прымусовай працы савецкіх людзей, гісторыя остарбайтараў замоўчвалася як у савецкай, так і германскай гістарыяграфіі. Дакументы аб рэжыме жыцця насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі, дзейнасці нямецкіх акупацыйных органаў, прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, судова-прававых, карных, фінансавых, навучальных, лячэбных і іншых устаноў доўгі час заставаліся засакрэчанымі. У навуковае карыстанне яны пачалі ўводзіцца толькі з канца 80-х гадоў XX ст. [1, с. 27]. Да яе навуковага асвятлення айчынныя даследчыкі прыступілі толькі ў апошнія дзесяцігоддзі. Асабліва актывізавалася гэтая праца з пачатку 90-х гадоў у сувязі з прыняццем урадамі Германіі і Аўстрыі рашэння аб выплаце кампенсацый за прымусовую працу былым остарбайтарам.

На акупаваных жа тэрыторыях выкарыстанне мясцовай працоўнай сілы акупанты пачалі выкарыстоўваць фактычна з першых дзён акупацыі.

Згодна з распараджэннем рэйхсміністра акупіраваных усходніх абласцей А.Розенберга ад 5 жніўня 1941 г. уводзілася абавязковая працоўная павіннасць для мясцовага насельніцтва ва ўзросце ад 18 да 45 год, у тым ліку і жанчын. У распараджэнні падкрэслівалася, што рэйхскамісары "могуць для пэўных груп жыхарства пашырыць або абмежаваць абавязак да працы". На практыцы, як сведчаць архіўныя дакументы, узроставыя рамкі працоўнай павіннасці карэкціраваліся на месцах і пашыраліся на жанчын ад 15 да 55-гадовага ўзросту [2, арк. 229]. Аднак, як бачна з успамінаў сведкаў, звычайна да прымусовай працы прыцягвалася моладзь і больш маладога ўзросту, а таксама жыхары больш сталага веку. У якасці прыкладу можна прывесці захопленыя партызанамі кавалерыйскага атрада Матавілава ў 1941 г. дакументы, сярод якіх была дакладная запіска ваеннага каменданта г. Барысава. У ёй адзначалася, што згодна інструкцыі ўсё працаздольнае насельніцтва ад 10 да 65 год узята на ўлік. Уведзена абавязковая працоўная павіннасць. Усе заняты на дарожных і земляных працах. Працоўныя калоны суправажае канвой [3, арк. 128–129]. Прыцягненне да прымусовай працы мела ў розных месцах свае асаблівасці, звязаныя з наяўнасцю працаздольнай працоўнай сілы, патрэбамі гаспадаркі і г.д. Агульным было патрабаванне ўліку і рэгістрацыі працоўнай сілы і яе прымусовае выкарыстанне ваеннымі і акупацыйнымі органамі. Улікам працаздольнага насельніцтва займаліся спецыяльна створаныя аддзелы і біржы працы (арбайтсамты). Галоўнай задачай гэтых органаў быў прымусовы ўлік усіх працаздольных і прыцягненне іх да працы. Яны адначасова з'яўляліся як органамі акупацыйнай адміністрацыі, так і органамі агульнагерманскай службы працы.

Так, напрыклад, усе жыхары Навагрудскай акругі ва ўзросце ад 14 да 60 год павінны былі зарэгістравацца да 10 лютага 1942 г. Пры рэгістрацыі падаваліся звесткі аб месцы жыхарства, даце нараджэння, сямейным становішчы, колькасці дзяцей, прафесіі і асвеце. За невыкананне ў вызначаны тэрмін рэгістрацыі парушальнік прыцягваўся да адказнасці ў выглядзе арышту, ці штрафу ў памеры 1 тысячы руб. [4, арк. 12].

Тэрыторыя сучаснага Столінскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўваходзіла ў склад былых Столінскага і Давыд-Гарадоцкага раёнаў Пінскай вобласці. Узбуйненне раёнаў у адзін раён адбылося ў студзені 1961 г. Напярэдадні вайны тут пражывала 100113 чал. З іх: 86965 беларусаў, 9021 яўрэяў і 3396 палякаў. Акупацыя Століншчыны нямецкімі войскамі адбылася ў першай дэкадзе ліпеня 1941 г. 6 ліпеня 1941 г. нямецкія войскі ўвайшлі ў Столін. Як і ў іншых захопленных раёнах ў першы месяц акупацыі раёнам кіравала ваенная камендатура, якая была ў жніўні заменена грамадзянскай адміністрацыяй. Століншчына была ўключана ў Генеральную акругу Валынь (Generalbezirk Wolyn), якая ў сваю чаргу дзялілася на 24 акруг – гебітаў [5, с. 307–308.] Столін атрымаў статус цэнтра акругі, у ім быў створаны

акруговы камісарыят (гебітскамісарыят) – орган, які кантраляваў працу грамадзянскага кіраўніцтва. На чале яго стаяў гебітскамісар. Гебітскамісарыят знаходзіўся ў былым палацы князя Радзівіла у Манькавіцкім парку. Лепшыя будынкі горада былі заняты ўпраўленнямі камісарыята, жандармерыяй, паліцыяй.

У Столінскім і Давыд-Гарадоцкім раёнах да вайны пераважала сельскагаспадарчая вытворчасць, пераважная частка насельніцтва займалася сельскай гаспадаркай. Акрамя працы па выкананню сельскагаспадарчых паставак жыхары раёнаў прыцягваліся да прымусовай працы на дарожным будаўніцтве, у лясной гаспадарцы, працы на Давыд-Гарадоцкай судаверфі і г.д.

З першых дзён акупацыі раёна захопнікі пачалі выкарыстоўваць мясцовае насельніцтва ў якасці дарэмнай працоўнай сілы як пры выкананні бягучых вайсковых спраў, так і пры рэалізацыі сталых гаспадарчых праграм і планаў акупантаў. Таму забяспячэнне мясцовай працоўнай сілай шэрагу прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, аб'ектаў ваенна-будаўнічага прызначэння было адной з галоўных функцый органаў акупацыйнай улады. На тэрыторыі Столінскага гебіта буйных прадпрыемстваў не было. З найбольш значных прадпрыемстваў была Давыд-Гарадоцкая судаверф, якая мела два лесапільныя заводы, дрэваапрацоўчы і кавальска-слясарны цэхі, прыстань. На другім буйным прадпрыемстве Давыд-Гарадка – гарбарным заводзе працавала каля 60 чал. У Століне напярэдадні вайны працавалі мэблевая фабрыка, слясарна-механічная, калёсная, бандарная майстэрні, дзе працавала каля 500 чал. Акрамя таго, на тэрыторыі Століншчыны было некалькі невялікіх лесапільных і цагляных заводаў, спіртзаводаў і млыноў. Зразумела, што акупанты імкнуліся выкарыстаць любую магчымасць, каб існуючыя прадпрыемствы працавалі на карысць фронту і Германіі. Асаблівую ўвагу яны ўдзялялі лясным багаццям, паколькі драўніна з'яўлялася ваеннай сыравінай. Таму па-драпежніцку высякаліся лясы, у тым ліку і векавыя дубы ў пойме Гарыні і Прыпяці. З першых дзён акупацыі пачалося метадычнае рабаванне сялянскіх гаспадарак Століншчыны. Акупанты шляхам вайсковай канфіскацыі імкнуліся як мага болей вывезці збожжа, садавіны, гародніны, буйной рагатай жывёлы, свіней, дамашняй птушкі і г.д. За невыкананне ці зрыў паставак прымяняліся штрафы, цялесныя пакаранні, турэмнае зняволенне і адпраўка сялян у працоўныя і канцэнтрацыйныя лагеры, расстрэлы і спаленне вёсак разам з насельніцтвам.

Знаёмства з архіўнымі матэрыяламі паказвае, што да канца 1942 г. асаблівых праблем з выкананнем паставак у акупантаў не было. Аднак з пашырэннем на тэрыторыю Століншчыны партызанскага руху, дзякуючы баявой актыўнасці падпольшчыкаў, узрастаючаму супраціўленню насельніцтва значная частка нарабаванага акупантамі дабра заставалася партызанам ці знішчалася. Так, былы камандзір партызанскага злучэння Антон Пятровіч Брынскі ў сваіх успамінах піша аб тым, што ў пачатку 1942 г. столінскія падпольшчыкі на станцыі Гарынь падпалілі будынак, у якім знаходзілася больш 200 свіней і каля 100 кароў, якія немцы адабралі ў насельніцтва і збіраліся

адправіць у Германію. Узнялася паніка. Выкарыстаўшы яе, падпольшчыкі змаглі загнаць кароў у лес, а потым раздзяліць іх паміж сялянамі суседніх вёсак [5, с. 325]. Шмат звестак аб дзейнасці партызан і падпольшчыкаў па зрыву эканамічных мерапрыемстваў захопнікаў ёсць сярод дакументаў партызанскіх фарміраванняў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Століншчыны. Ішла жорсткая барацьба на выжыванне. У ёй месцамі прымяняліся ўсе магчымыя сродкі. Адным са сродкаў усталявання «новага парадку», барацьбы супраць партызан, вынішчэння мірнага насельніцтва былі карныя аперацыі, якія праводзіліся з першых дзён акупацыі. Сельскае насельніцтва неахвотна плаціла падаткі, а ў большасці вёсак партызанскай зоны іх прыходзілася браць сілай. Пры гэтым акупанты праводзілі палітыку «выпаленай зямлі», пад час якой вынішчалася насельніцтва і спальваліся партызанскія вёскі. У 1942 г. была спалена з часткай насельніцтва вёска Гарадная. У 1943 г. такі лёс напаткаў вёскі Беразцы, Бухлічы, Варані, Велямічы, Кораб'е, Люты Бор, Ястрабель. Але найбольшага размаху палітыка "выпаленай зямлі" дасягнула ў 1944 г., калі ў жудасным агні згарэлі разам з часткай жыхароў вёскі Аздамічы, Альманы, Альшаны, Атвержыцы, Белавуша, Вялікія Вікаравічы, Вялікі Лес, Гарадзішча (хутары), Кароцічы, Калонія-Пасошкі, Малыя Вікаравічы, Люты Бор, Мачуль, Нячатава, Струга, Фядоры, Хотамель. Цалкам былі спалены вёскі Рубель(730 двароў, знішчана 122 чал.), Беразцы (203 двары, 28 чал.), Атвержыцы (131 двор, 7 чал.), Хотамель (134 двары, 7 чал.), адна хата з 173 засталася ў в. Калонія-Пасошкі, дзве з 202 у в. Альманы, тры з 140 у в. Кароцічы, 40 з 340 у в. Манькавічы.

Вялізныя страты на франтах, мабілізацыя ў войска ўсё новых кантынгентаў вайсковаабавязанных прывялі да вострага дэфіцыту працоўнай сілы, што вымусіла Гітлера пайсці на шырокае выкарыстанне прымусовай працы грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных з захопленых Германіяй краін.

У кастрычніку 1941 г. Гітлер дазволіў спачатку выкарыстанне працы савецкіх ваеннапалонных для патрэб ваеннай эканомікі, а ў лістападзе Герынг выдаў дырэктывы аб выкарыстанні савецкай працоўнай сілы, што стала першым сігналам будучай буйнамаштабнай акцыі па мабілізацыі савецкага насельніцтва на працу ў Германіі.

Непасрэдная вярбоўка на працу ў Германію пачала праводзіцца крыху пазней, з пачатку 1942 г. Вярбовачная кампанія праводзілася нямецкімі біржамі працы і іншымі ўстановамі і суправаджалася шырокімі прапагандысцкімі мерапрыемствамі. Першапачаткова яна праводзілася на добраахвотнай аснове. Кожны, хто запісваўся на выезд, праходзіў адпаведную медыцынскую камісію і паліцэйскую праверку. Пэўнымі ільготамі карысталіся сем'і добраахвотнікаў. Ім выдавалася грашовая дапамога, сем'ям аказвалася дапамога ў вядзенні сельскагаспадарчых работ і г.д. Добраахвотнікам дазвалялася карыстацца пачтовай сувяззю. Поўных звестак аб колькасці добраахвотнікаў з Беларусі няма. Зразумела, што пэўная частка насельніцтва паддалася на спакусы, якія абяцала прапаганда: набыццё прэстыжных прафесій, у тым ліку вадзіцеляў,

высокая заработная плата, жаданне паглядзець як жывуць там людзі і г.д. Аднак па шэрагу прычын масавай гэтая з'ява не сталася. Як бачна з матэрыялаў Нюрнбергскага працэсу, з пяці мільёнаў замежных рабочых, добраахвотна на працу ў Германію прыехала не болей 200 тыс. чал.

Таму акупанты вымушаны былі прыбягаць да прымусовага вывазу моладзі. У маі 1942 г. генеральны ўпаўнаважаны па выкарыстанні працоўнай сілы гаўляйтэр Фрыц Заўкель выдаў спецыяльнае распараджэнне аб прымусовай працоўнай мабілізацыі. Асобы, якія ўхіляліся ад вярбоўкі і рэгістрацыі, аб'яўляліся сабатажнікамі і партызанамі. Адначасова ён патрабаваў значна скараціць патрэбы ў працоўнай сіле на месцах, абмяжаваўшы іх толькі ваеннымі патрэбамі. Гэта канчаткова развязала рукі тым, хто на месцах адказваў за барацьбу супраць партызанаў і за пастаўку рабочай сілы ў Германію.

Як бачна са зводкі № 193 паліцыі бяспекі і СД аб падзеях у СССР ад 17 красавіка 1942 г.: "Генеральны камісарыят Беларусі павінен быў паставіць у рэйх у адпаведнасці з распараджэннем Заўкеля 100 тыс. чал. Аднак да сённяшняга часу пастаўлена толькі 17 тыс. Каб выканаць устаноўленую норму пастаўкі працоўнай сілы, з сённяшняга часу ўсякі прынцып добраахвотнасці адмяняецца і прымяняюцца меры прымусовага набору працоўнай сілы"! [6, с. 91]. Таму паўсюль гітлераўцы прыступілі да прымусовага набору, які ажыццяўляўся самымі рознымі спосабамі. Найбольш характэрнымі з іх былі наступныя.

1. Пазыў па абвестках. Пад адказнасць службовых асоб дасылаліся абвесткі тым, хто быў узяты перад гэтым на ўлік. У павесцы прызначаўся дзень і час, калі трэба было з'явіцца на медыцынскую камісію. Пры станоўчым рашэнні камісіі прызыўнікі накіроўваліся на зборныя пункты, адкуль накіроўваліся далей. Гэты спосаб найбольш быў характэрны для раёнаў, дзе была моцная мясцовая ўлада і адсутнічалі партызаны. Знаёмства з дакументамі акупантаў паказвае, што нягледзячы на ўзмоцненую прапаганду жадаючых паехаць добраахвотна было няшмат.

2. Спосаб масавых аблаў, калі войскамі, паліцыяй і жандармерыяй ацэпліваліся цэлыя гарадскія раёны, кварталы, вёскі і іншыя населеныя пункты, а таксама месцы масавых збораў насельніцтва – гандлёвыя рынкі, вакзалы, прадпрыемствы і г.д. У якасці прыклада можна прывесці шырокамаштабную аперацыю, якая атрымала назву "Чароўная флейта", 17 красавіка 1943 г. у 4 гадзіны раніцы ўвесь горад Мінск быў акружаны з усіх бакоў. Кожны квартал і кожны будынак быў падвергнуты вобыску. Праз створаныя 6 фільтрацыйных пунктаў на працягу 6 дзён было прапушчана 52500 чал. Многія з іх былі арыштаваны, а больш тысячы накіравана на працу ў Германію [7, с. 369].

Трэцім і найбольш распаўсюджаным спосабам набору быў захоп насельніцтва, у тым ліку і партызан, пад час правядзення супрацьпартызанскіх акцый. Гэты спосаб шырока пачаў прымяняцца з лета 1942 г. і найбольш быў характэрным для 1943–1944 гг., калі згодна распараджэння ОКВ ад 8 мая 1943 г. усе асобы мужчынскага полу ва ўзросце ад 16 да 55 гадоў, якія былі захоплены

пад час правядзення карных аперацыяў, пачалі лічыцца ваеннапалоннымі. Згодна распараджэння Бах–Зялеўскага ваеннапалоннымі з верасня 1943 г. пачалі таксама лічыць усіх мужчын, якія пражывалі ў непасрэднай блізасці ад партызанскіх зон [7, с. 13]. Фактычна ўсе аперацыі, якія праводзіліся супраць партызан у гэты перыяд, утрымліваюць звесткі аб адабраных для адпраўкі ў Германію. Так, у справаздачы аб выніках аперацыі "Герман", якая праводзілася супраць партызан на тэрыторыі былой Баранавіцкай вобласці, пад кіраўніцтвам Готберга, адзначалася: забіта 4280 чал. і ўзята ў якасці рабочай сілы 20944, у тым ліку 4178 дзяцей [7, с. 14].

Па афіцыйным дадзеным аддзела перасялення і рэпатрыяцыіі СНК БССР, з агульнай колькасці 399 374 чал., якія былі вывезены на прымусовую працу ў Германію, на 29 мая 1947 г. назад вярнулася каля 250 тыс. чал. [8, с. 287]. З тэрыторыі сучаснага Столінскага раёна за гады акупацыі было вывезена на прымусовую працу ў Нямеччыну 7035 чал. (7,03 % ад агульнай колькасці насельніцтва!), а з тэрыторыі Пінскай вобласці 30981 чал. [9]. Па дадзеных 22 сакавіка 1949 г. у вобласці налічвалася да 18 тыс. чал. рэпатрыянтаў, у тым ліку 3700 чал. з амерыканскай зоны акупацыі, да 3 тыс. з англа-французскай, а астатнія з Чэхаславакіі, Польшчы, Германіі і іншых краін [8, с. 282]. Усе яны пасля вяртання запаўнялі апытальныя лісткі пры праходжанні праверкі (фільтрацыі) адпаведнымі органамі дзяржаўнай бяспекі. У іх знаходзіцца шмат карыснай інфармацыі аб абставінах угону, месцы і ўмовах працы, паўсядзённага жыцця і ўмовах выжывання, адносінах да остарбайтароў нямецкага насельніцтва і шмат іншых. З апытальнага ліста Вольгі Паўлаўны Кецька, 1925 г.н., ураджэнкі Давыд-Гарадка: " ...Угнана ў Германію у кастрычніку 1942 г. Везлі ў таварных вагонах, якія былі перапоўнены, сядзелі на падлозе. Дзверы былі зачынены. Па дарозе не давалі ніякай яды. Калі прыехалі ў Германію, заключылі ў лагер, дзе трымалі пад аховай нямецкіх паліцэйскіх. Працавала на фабрыцы чорнарабочай. Атрымлівала 10 марак. Харчаванне было дрэннае. Два разы на дзень гнілая капуста ці бручва і 300 грамаў хлеба. За грошы, якія атрымлівала, купіць нічога не магла, бо рускім не адпускалі. За увесь час працы я атрымала адну сукенку і калодкі. Падвяргалася збіенню ў гестапа, дзе знаходзілася, за тое, што праехала ў нямецкім цягніку" [9]. З апытальных лістоў бачна, што жыхары раёна – мужчыны і жанчыны працавалі на прамысловых прадпрыемствах, фабрыках, заводах, у сельскай гаспадарцы, на будаўніцтве, на розных іншых работах.

У сучасны момант у Беларусі і на Століншчыне пражывае значная колькасць былых остарбайтараў. Іх успаміны аб гадах, праведзенных у няволі, іх ураженні ад убачанага там, споведзі аб жыцці і працы, аб адносінах да іх звычайных немцаў, аб вяртанні на Радзіму з'яўляюцца карыснай крыніцай, якая значна дапаўняе нашы веды аб акупацыйным рэжыме, створаным нацыстамі падчас мінулай вайны. Намі запісаны шэраг успамінаў былых остарбайтараў 1925–1930 г.н., якія былі вывезены ў 1942–1944 гг. Іх успаміны ўражваюць юнацкім і дзіцячым успрыманнем падзей, асобных дэталей паўсядзённасці таго

часу, пра якія не магчыма знайсці звестак нават у архіўных дакументах. Запіс успамінаў былых остарбайтараў Століншчыны дазволіў значна пашырыць звесткі аб тым, як праходзіў працэс мабілізацыі моладзі на прымусовую працу, удакладніць геаграфію і месцы працы, умовы пражывання і г.д. Так, з успамінаў жыхароў вёсак Аздамічы, Альшаны, Цераблічы, Семігосцічы і інш. бачна, што на Століншчыне пачынаючы з 1942 г. ажыццяўлялася пастаянная адпраўка насельніцтва на прымусовую працу ў Нямеччыну. Найбольш значнымі былі масавыя адпраўкі восенню 1942 г., вясной і летам 1943 г. і вясной-летам 1944 г. У вёсцы Семігосцічы было тры масавыя адпраўкі на прымусовую працу ў Германію. Першая была ў пачатку кастрычніка 1942 г. Яна праводзілася па загаддзя разданым абвесткам моладзі з улікам узросту і колькасці моладзі ў сем'ях. Быў дадзены час на збор і сказана, што патрэбна ўзяць з сабою. Першая група была адпраўлена ў Столін 5 кастрычніка 1942 г. Было ўзята больш 30 чал., а затым, праз некалькі дзён была адпраўлена другая група, якая была яшчэ большай за першую. У другой групе было вывезена некалькі мужчын больш сталага ўзросту – мясцовых актывістаў, якім пагражаў арышт і яны вымушаны былі хавацца. У тым ліку Літвін Павел Цімафеевіч, Андрайчук Аляксей Паўлавіч, Жогаль Іван Яўсеявіч, Карнейчук Канстанцін Пятровіч (першы старшыня калгаса) і інш. Як казалі, стараста сам прапанаваў ім ехаць, таму што ведаў, што немцы могуць у любы час растраляць іх і іх сем'і [10, с. 274, 288–289].

Трэці масавы вываз быў у красавіку 1943 г., на трэці дзень Пасхі. З раніцы вёска была ачэплена немцамі і паліцэйскімі. Усіх маладых людзей, хлопцаў і дзяўчат 1925–1928 г.н. сагналі ў цэнтр вёскі ў клуб. Тут па загаду немцаў мясцовыя паліцаі ўдакладнілі па спісе імёны затрыманых і пад страхам смерці было загадана з'явіцца ўсім, хто быў у спісе, але не было на месцы. За неяўку пагражалі расстрэлам бацькоў і сваякоў. Ад адпраўкі вызваляліся толькі сямейныя пары і паліцаі. Усяго з вескі было вывезена 107 чал. Тры з іх: Баган В.І., Жогаль І.Ф. і Карняйчук І.Ф. загінулі ў Германіі [10, с. 291].

Такая ж карціна была і па іншых вялікіх весках Століншчыны, дзе пражывала шмат моладзі і дзе знаходзіліся нямецкія гарнізоны.

1. Лісава, Л. Дакументальны фонд Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944) // Беларусь у гады Другой сусветнай вайны: урокі гісторыі і сучаснасць. Матэрыялы Рэсп.навук. канф., прысв. 50-годдзю Перамогі, Мінск, 26-27 крас.1995 г. – Мн., 1995. С. 27–30.

2. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 623, воп.1, спр.173.

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф.4, воп.33 а. спр.405.

4. Дзяржаўны архіў Гродненскай вобласці, ф.642, воп.1, спр.1, а.

5. Советская Украина в годы Великой Отечественной войны. Док. и материалы в трех томах. Т. 1. Киев, 1985.

6. Белорусские остарбайтеры. Кн. 1.,- Мінск., 1996.

7. Бринский А.П. По ту сторону фронта. Кн. 2.- М.,1961.

8. Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі, Мінск.,1995.

9. Белорусские остарбайтеры. Историко-аналитическое исследование/ Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко, Н.А. Бондаренко, В.Д. Селеменев. Под ред. Г.Д. Кнатько.– Мн.: НАРБ, 2001.

10. Навіны Палесся.1998.11 кастрычніка.

11. Беларусь у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны: масавыя забойствы нацыстаў. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. 2 ліпеня 2004 г, Мінск, 2005.

В.І. МАСЮК

## МЕСЦА РУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ НА ПАЛІТЫЧНАЙ АРЭНЕ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Палітыка тэрору і адміністратыўныя меры закранулі ўсе канфесіі і наогул ўсю духоўную сферу савецкага грамадства, што прывяло да таго, што да канца 30-х гг. XX ст. ураду амаль удалося здзейсніць сваю мэту па ўсталяванню атэістычнага грамадства [1, с. 36]. Такая палітыка прывяла да скрытай дзейнасці праваслаўнай царквы, якая здзяйснялася з мэтай вытрымаць націск з боку ўлады.

Царкоўная дзейнасць перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны насіла падпольны характар, храмы былі зачынены і разбураны ці выкарыстаны для патрэб савецкай улады. Рэлігійная актыўнасць як клірыкаў, так і міран мела вынікам рэпрэсіўныя меры, таму і здзяйснялася дзейнасць рэлігійных устаноў на перыяд пачатку вайны скрытна, але з развіццём падзей вайны царква ўсё больш актыўна праяўляла сябе. Гэтага, на наш погляд, патрабавала патрыятычная пазіцыя і разуменне немагчымасці пакінуць народ у цяжкі час. Такая актывізацыя насіла шматбаковы характар. Патрыяршая царква пад час вайны імкнулася да цэнтралізацыі ў адзінай барацьбе з ворагам, але атрымаўся раскол. Частка клірыкаў заходніх рэгіёнаў перайшла на бок немцаў, але імкненні да аўтакефаліі не былі пацверджаны юрыдычна і пры вызваленні заходніх тэрыторый царква была зноў аб’яднана, а клірыкі-здраднікі падвергліся рэпрэсіям. Галоўным напрамкам дзейнасці патрыяршай царквы была патрыятычная дапамога насельніцтву, якая адлюстроўвалася ў правядзенні царкоўных службаў, ідэалагічнай і маральнай падтрымцы, прапагандзе, харчовай дапамозе, забеспячэнні вайскоўцаў зброяй. Самі царкоўныя будынкі былі выкарыстаны ў якасці прытулку для тых, хто страціў свае хаты. Будынкі храмаў і касцёлаў служылі аховай ад авіябомб. Царква збірала сродкі на ваенныя патрэбы. Патрыятычная дзейнасць царквы, якая імкнулася да легалізацыі, прымусіла дзяржаву змяніць свае погляды, вынікам чаго стала сустрэча І. Сталіна з кіраўніцтвам праваслаўнай царквы.

Такі вялікі ўплыў царквы на насельніцтва і яе шматгранная патрыятычная дзейнасць выдвінулі Рускую Праваслаўную царкву на значныя пазіцыі на палітычнай арэне. Тым больш пачалася цэнтралізацыя і аб'яднанне праваслаўнай царквы вакол Маскоўскай патрыярхіі і яе кіраўніка мітрапаліта Сергія (Старгарадскага), што надавала Рускай Праваслаўнай царкве яшчэ большае значэнне.

Першым палітычным крокам Рускай Праваслаўнай царквы стаў зварот мітрапаліта Сергія (Старгарадскага) да насельніцтва СССР 22 чэрвеня 1941 г. са словамі падтрымкі і спачування. З гэтага ж моманту праваслаўная царква канчаткова выйшла з "падполля" і заняла актыўную патрыятычную пазіцыю. З гэтага ж часу царква стала аб'ектам кіравання народамі, якія імкнуліся падначаліць сабе як СССР, так і Германія.

У гэты ж перыяд сама праваслаўная царква падзялілася на прыхільнікаў Маскоўскай патрыярхіі, г.зн. прыхільнікаў СССР, і прыхільнікаў Германіі, якія ў большасці сваёй знаходзіліся на заходніх тэрыторыях СССР.

30 жніўня 1942 г. у Мінску адбыўся так званы «Усебеларускі Праваслаўны Царкоўны Сабор». Ініцыятарамі яго былі прыхільнікі аўтакефаліі на чале з Ф. Нарко [2, с. 67–69]. Вынікам чатырох дзён сабора стала распрацоўка статута Беларускай Царквы і пацвярджэнне мерапрыемстваў па дасягненню аўтакефаліі. І хоць у матэрыялах сабора было сказана пра незалежнасць Беларускай Царквы, але на самой справе трэба была згода ўсіх Цэркваў. Але ў сувязі з наступнымі падзеямі вайны і адносінамі клірыкаў і міран да аўтакефаліі такая згода не была атрымана ніколі. Афіцыйная аўтакефалія пацярпела крах. Але існаванне яе прыходаў працягваецца да сённяшніх дзён. Такім чынам, палітыка немцаў адносна царквы на Беларусі, якая праводзілася мірным шляхам, так і не была падтрымана беларускім духавенствам.

Патрыяршая царква падчас вайны імкнулася да цэнтралізацыі ў адзінай барацьбе з ворагам, акрамя таго мэтай яе была легалізацыя дзейнасці царквы і скасаванне старых прававых актаў, якія абмяжоўвалі і забаранілі дзейнасць праваслаўнай царквы і іншых рэлігійных арганізацый на тэрыторыі СССР. Таксама праваслаўная царква змагалася за рэабілітацыю святароў, адкрыццё храмаў, дазваленне прапаганды, правы вернікаў і імкнулася аказаць ім дапамогу. З гэтымі патрабаваннямі і выступала Руская праваслаўная царква на палітычнай арэне.

Дакладныя мэты супрацоўніцтва кіраўніцтва СССР з Рускай Праваслаўнай царквой не ўсталяваны, існуе шмат поглядаў гісторыкаў і навукоўцаў. Ёсць погляды, што супрацоўніцтва дзяржавы з царквой звязана непасрэдна з палітыкай. Прафесар А.К. Святазарскі, як і прафесар Шкароўскі М.В., лічаць, што афіцыйнае аднаўленне дзейнасці царквы і сустрэча І. Сталіна з кіраўніцтвам Рускай Праваслаўнай царквы 4 верасня 1943 г. звязана з міжнароднай палітыкай Савецкага Саюза – бальшавікі жадалі паказаць дэмакратычнасць і свабоду веравызнання вядучым краінам сусвету, што

безумоўна спрыяла павышэнню ролі СССР на міжнароднай арэне [3, с. 213-221]. Прычынай хуткага вырашэння шэрагу падзей і пытанняў, якія цікавілі Рускую Праваслаўную царкву, як адзначае М.І. Адзінцоў, стала Тэгеранская канферэнцыя [4, с. 21]. Гэта значыць, што было ў Сталіна жаданне выставіць узаемаадносіны паміж дзяржавай і царквой у СССР на міжнародным ўзроўні як лаяльныя і дэмакратычныя.

Такім чынам, Руская праваслаўная царква, выступіўшы на палітычнай арэне на баку Савецкага Саюза, атрымала магчымасць на адкрыццё храмаў, адкрытую дзейнасць і абранне патрыярха. Разам з тым рабіліся і іншыя саступкі царкве. Дабрачынная дзейнасць царквы, на наш погляд, мела станоўчыя вынікі не толькі для насельніцтва і дзяржавы, але і для самой царквы. Трэба адзначыць, што легалізацыя рэлігійнай дзейнасці мела для самой царквы другаснае значэнне, на першым месцы былі заўсёды веруючыя і Радзіма. Трэба адзначыць, што и дзяржава мела свае плённыя вынікі ад палітычнага супрацоўніцтва з царквой як унутры краіны пры барацьбе з ворагам, так і на міжнароднай арэне для падняцця свайго аўтарытэту.

1 Васильева, О.Ю. Советское государство и деятельность Русской православной церкви в годы Великой Отечественной войны / О.Ю. Васильева. - М.: Институт истории АН СССР, 1990.–191 с.

2 Informator o archiwalich z kresow polnocno-wshodnich Drugej Rzeczypospolitej w yasobie archiwow bialoruskich i LCVA w Wilnie / Bialystok, 1996. – 51 с.

3 Шкаровский, М.В. Русская православная церковь и религиозная политика советского государства в 1939 – 1964 гг. / М .В. Шкаровский. - СПб., 1996. – 178 с.

4 Одинцов, М.И. Власть и церковь в странах Восточной Европы, 1939–1958 / М.И. Одинцов. – М., 2000. – 380 с.

И.В. САБЛИН

## ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ ОРГАНОВ ВОЕННОГО УПРАВЛЕНИЯ С ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКОВЬЮ В ПЕРИОД ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ НА ОККУПИРОВАННОЙ ТЕРРИТОРИИ

Многовековая история Беларуси свидетельствует, что Православие всегда являлось духовной основой менталитета белорусского народа и его христолюбивого воинства – защитников Отечества. За более чем тысячелетнее существование Православной Церкви на белорусских землях ее судьбы всегда были неразрывно связаны с судьбой народа. Всегда, при нашествии иноплеменных полчищ, колокольный набат святых обителей и церквей сзывал народ на защиту Родины, а духовные пастыри благословляли воинство на это богоугодное дело.

В начале Великой Отечественной войны духовная ситуация в стране кардинальным образом отличалась от предшествующих веков. Годы государственного богоборчества и атеистической пропаганды не прошли бесследно. Многие оставили веру отцов. Давно умолкли колокола, все монастыри и очень многие храмы были закрыты, а духовное окормление военнослужащих священнослужителями Русской Православной Церкви отменено. Но когда наступило время тяжелейших испытаний, духовная атмосфера в стране стала преображаться. И, прежде всего, во всей своей силе стал проявляться патриотизм архипастырей, пастырей и мирян, оставшихся верными Церкви Христовой [1, с.7].

Уже в первый день Великой Отечественной войны – 22 июня 1941 г., глава Русской Православной Церкви Патриарший местоблюститель, митрополит Московский и Коломенский Сергий (Страгородский) обратился ко всем приходам с посланием «Пастырям и пасомым Христовой Православной Церкви», в котором взывал: «...Фашистские разбойники напали на нашу Родину. Попирая всякие договоры и обещания, они внезапно обрушились на нас, и вот кровь граждан уже орошает родную землю... Церковь Христова благословляет всех православных на защиту священных границ нашей Родины...» [2, с.93–94].

Это событие не могло не изменить отношения советского государства к Православной Церкви. Уже первые слова И.В. Сталина к народу 3 июля 1941 г.: «Дорогие соотечественники! Братья и сестры!» были подсказаны не марксистско-ленинской идеологией, а скорее церковной проповедью. Реальная действительность заставляла руководство ВКП(б) начать пересмотр своей религиозной политики, перейти к диалогу во имя единства верующих и атеистов в борьбе с общим врагом [3, с.195–196].

Многие лица духовного звания были призваны на фронт в первые дни и месяцы войны, некоторые прошли через ее жесточайшие испытания, иные пали на поле брани. Другим священнослужителям выпало служить в храмах, которые стали открываться в тылу, некоторые оказались в партизанских отрядах и среди подпольщиков. Сотни священнослужителей стали служить во вновь открывавшихся храмах на временно оккупированной врагом территории.

Как известно, вероломное нападение фашистской Германии на Советский Союз 22 июня 1941 г. началось с ударов немецкой армии по белорусской земле. Продвижение немецких войск было настолько стремительным, что уже к сентябрю 1941 г. вся территория Белоруссии была в руках агрессора. На оккупированной территории оказалось почти 8 млн. жителей Белоруссии и около 1 млн. красноармейцев, попавших в плен в ходе неудачных боев на белорусской земле. Причем оккупационный режим длился более 3 лет, вплоть до освобождения 28 июля 1944 г. города Бреста [4, с.87].

Борьба населения Беларуси против захватчиков началась сразу же после оккупации. Она вылилась не только в невыполнение установленных оккупантами порядков, но и в вооруженное сопротивление. Партизанские

отряды и группы создавались как из местного населения, так и из военнослужащих-окруженцев [5, с. 78].

Многие священнослужители участвовали в борьбе с захватчиками на оккупированных немцами территориях. Мера участия была разной – от молитв о спасении Отечества – до борьбы с врагом с оружием в руках в партизанских отрядах. Однако были и такие лица духовного звания, которые по тем или иным причинам стали выполнять все предписания оккупационных властей в отношении религиозной деятельности и не поддерживали партизанское движение, а некоторые из них даже боролись с партизанами и подпольщиками. Тем не менее, и среди партизан было разное отношение к православной вере и Церкви – от жесткого неприятия до сочувствия и глубокой веры, а сами партизанские отряды различались по своим целям и задачам. Кроме тех, которые подчинялись Центру партизанского движения в Москве, на оккупированных территориях действовали и другие вооруженные отряды [6, с. 198].

Помимо изложенного, следует отметить, что в Белоруссии православные священнослужители становились жертвами как нелегальных отрядов украинских националистов, так и бойцов польской Армии Крайовой, которые нередко сражались не только с немцами, но и с партизанами и, кроме того, откровенно бандитских отрядов, называвших себя партизанами [7, с. 339–347].

Рассматривая проблему «священники и партизаны», нельзя забывать о стихийном, бурном развитии церковной жизни на оккупированных немцами землях. Уже за первые месяцы войны там открылись исключительно по воле верующего народа сотни храмов. Всего за три года оккупации в условиях голода, разрухи, ограниченных материальных возможностей силами верующих было восстановлено более 40 % дореволюционного количества церквей. По разным оценкам, число храмов, открытых на оккупированной территории СССР, варьирует от 7,5 тыс. до 10 тыс. Вокруг храмов сплотилась значительная часть населения и, вопреки ожиданиям немцев, они стали центрами национального самосознания. Результаты опросов и переписей населения, проводившихся немцами в оккупированных городах СССР, свидетельствовали о высоком проценте верующих среди опрошенных (до 90 %) и низком – атеистов: от 1 до 4 %. Как справедливо отмечал М.В. Шкаровский: «Эти данные нельзя принимать за полностью соответствующие реальной ситуации. Ведь среди ушедших на восток с советскими войсками был большой процент неверующих; кроме того, часть населения могла думать, что фашисты будут ассоциировать атеистов с коммунистами, и поэтому скрывали свои подлинные взгляды» [3, с. 137–183].

Как вспоминал впоследствии протоиерей Алексий Ионов: «Религиозное пробуждение было общим, массовым и стихийным. Народ, как в городах, так и в сельской местности... сам шел на открытие храмов, на их ремонт и украшение» [6, с. 199].

Первоначально процесс открытия храмов имел стихийный характер: как только передовые немецкие части захватывали то или иное селение, его жители старались отворить врата местного храма. Так, например, храм во имя святого благоверного Великого князя Александра Невского, что на Военном кладбище г. Минска, был открыт благочестивыми минчанами уже на второй день после того, как город оказался в руках у немцев. К концу 1941 г. только в пределах одной Минской епархии было открыто около 120 храмов. За сравнительно короткое время возобновились богослужения во всех районных центрах Витебской области. Более 20 храмов открылось в пределах Бобруйского округа. Оккупанты никаких препятствий, как правило, этому не чинили. Постепенно у оккупационных властей формировались взгляды относительно того, как использовать это стихийное стремление народа в своих интересах [4, с. 87–88].

Поддержка руководством гитлеровской Германии Православной Церкви на оккупированных территориях СССР была вопросом тактики, а атеизация проживавшего там населения – вопросом стратегии. Первоначально часть верующего населения проявляла чувство благодарности германской армии за «возвращение» религиозной свободы. Однако верующие и не предполагали, что нацисты, стоявшие у руководства Германии, в действительности хотели бы иметь обратный результат. Но далее, почти во весь период оккупации, главную роль в практическом осуществлении религиозной политики на оккупированных территориях СССР играли не офицеры вермахта, а рейхсминистерство занятых восточных территорий и его рейхскомиссары. А они, как и их шеф, один из главных идеологов нацизма Альфред Розенберг, повешенный по приговору Нюрнбергского трибунала, были враждебны всякой форме христианства. Начальник группы религиозной политики вышеуказанного германского министерства Карл Розенфельдер писал в меморандуме от 31 января 1943 г.: «Определяющая точка зрения для германского политического руководства заключается в том, что всякое христианское церковное направление по своей глубинной сути находится в непреодолимой мировоззренческой противоположности к национал-социализму... Я повторно указываю на то, что со стороны германской администрации неверно придавать слишком большое значение Православной Церкви, как средству управления людьми» [3, с. 137–183].

Реальная жестокая политика нацистов на оккупированной территории вскоре показала местному населению истинное лицо «освободителей». Так, в Белоруссии, по приказу генерал-комиссара Кубе в 1941–1942 гг. за одного убитого немца расстреливали 50–100 невинных мирных жителей, что вызывало лишь горячую ненависть к оккупантам и быстрый рост партизанского движения. Немецкие власти пытались даже ввести григорианский календарь вместо принятого в Русской Православной Церкви юлианского календаря, что вызывало бурный протест верующих.

На оккупированной территории, по разным оценкам, проживало не менее 60–70 миллионов граждан СССР, и у многих из них родные и близкие воевали в Красной Армии. Поэтому с настроениями этой части населения, с их

проявлениями патриотических чувств, с приверженностью многих к Православию должны были считаться все: и руководители воюющих стран, и те, кто воевал на фронтах. В том числе, и партизаны.

Значительная часть советских партизан стала относиться к священнослужителям положительно, начиная с сентября 1943 г., когда произошла встреча в Кремле И.В. Сталина с тремя митрополитами: Сергием (Страгородским), Алексием (Симанским) и Николаем (Ярушевичем), и был образован Совет по делам Русской Православной Церкви при Совете Народных Комиссаров СССР [2, с. 96; 3, с. 205–206].

Среди священнослужителей, активно участвовавших в борьбе с захватчиками на оккупированных немцами территориях СССР, был и настоятель Одрижинской Свято-Успенской церкви Ивановского района Брестской области Василий Данилович Копычко. Он родился 22 июня 1905 года на Пинщине в Брестской области. В г. Речице окончил гимназию, затем, по возвращении в Пинск и завершении учебы в реальном училище, вступил на путь церковного служения. С самых первых дней войны отец Василий оказывал посильную помощь отступающим солдатам и офицерам, попавшим в окружение, и раненым воинам Красной Армии, призывая к этому своих знакомых и верующих.

Летом 1942 г. партизанскими подпольными группами почти всему духовенству на оккупированных территориях было передано послание Местоблюстителя Патриаршего престола митрополита Сергия «К верным чадам Русской Православной Церкви». Получил его и отец Василий. Партизаны точно установили, что это послание распространяется среди верующих в переписанном виде отцом Василием. Через некоторое время его дом стал местом встреч подпольщиков с партизанами, а в экстремальных случаях – надежным укрытием с добрым советом и помощью.

С начала войны до ее победного завершения отец Василий духовно укреплял своих пасомых, совершая богослужения ночью, без освещения, чтобы не быть замеченным. Почти все жители окрестных деревень приходили на службу. Отважный пастырь рассказывал верующим о положении на фронтах, призывал противостоять захватчикам, переписывал и передавал сводки Совинформбюро, партизанские листовки, обращенные к солдатам Русской освободительной армии (РОА) и полиции. Отец Василий организовал среди крестьян сбор одежды, обуви, продуктов для раненых партизан, присылал им оружие.

Вот как описывает деятельность отца Василия и свою первую встречу с ним командир Пинской партизанской бригады И. Шубитыдзе: «...Мы, шутя, называли его своим агитатором и однажды пригласили в партизанский лагерь. Он охотно приехал в сопровождении партизан. Копычко долго присматривался к нашей жизни, к нашим порядкам, обошел с десяток землянок и за ужином, который приготовили специально для него в штабе, разговорился: «Вот и верь этим немцам! Обманщики, безбожники, бандиты! Вижу, что вы все

православные, дай вам Бог здоровья! Я так и говорил своим прихожанам...» Было видно, что Копычко полюбил нас, радовался, что не ошибся в своих предположениях, обещал молиться о нас и помогать, чем может. Отправили мы его из лагеря торжественно, на тачанке, с охраной. С этого времени Копычко стал нашим связным. Он сдержал свое слово, помогал не только молитвами, но и материально: собирал продукты для раненых, присылал временами и оружие» [6, с. 199–200].

В конце 1943 г. гестапо стало известно о его активной связи с партизанами. Карательный отряд особого назначения получил приказ публично казнить отца Василия и его семьи. Благодаря подпольщикам об этом узнали в штабе партизанской Пинской бригады. В ту же ночь отец Василий был перевезён в партизанскую зону, а на рассвете к его дому прибыли каратели и подожгли Храм и церковноприходской дом.

За заслуги перед Родиной протоиерей Василий Копычко был награжден орденом Отечественной войны II степени, медалями «Партизану Отечественной войны» I степени, «За доблестный труд в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг.», «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг.» и другими.

В Пинском партизанском соединении служил протоиерей Александр Федорович Романушко, настоятель церкви села Мало-Плотницкое Логишинского района Пинской области. Он не раз участвовал в боевых операциях, ходил в разведку, был в полном смысле слова, партизанским батюшкой. В оставленных некоторыми священниками храмах и местностях, где церкви были сожжены, отец Александр, совершал отпевания расстрелянных, заживо сожженных, а также павших на поле боя партизан. И неизменно во время богослужения или при исполнении треб призывал верующих помогать партизанам и защищать родную землю от фашистов.

Когда летом 1943 г. к командиру партизанского соединения генерал-майору В.З. Коржу, обратились родственники убитого партизанами полицая с просьбой «командировать» на похороны партизанского священника, он предоставил право самому отцу Александру принять или отклонить приглашение. Один священник отказался, а отец Александр согласился. Взял облачение, кадило и в сопровождении двух автоматчиков выехал в деревню. На кладбище была выставлена вооруженная охрана. Все приготовились слушать отпевание. Обведя глазами собравшихся, отец Александр, обращаясь к матери и отцу убитого, сказал: «Не наших молитв и «со святыми упокой» своей жизнью заслужил во гробе предлежащий. Он – изменник Родины и убийца невинных детей и стариков. Вместо «Вечной памяти» произнесем «Анафема»». Среди изумленных собравшихся установилась мертвая тишина. Все сказанное священником прозвучало очень смело и могло повлечь за собой его гибель. Но отец Александр, подойдя к полицаям, продолжал: «К вам, заблудшим, моя последняя просьба: искупите перед Богом и людьми свою вину и обратите своё оружие против тех, кто уничтожает наш народ, кто в могилы закапывает живых

людей, в Божьих храмах заживо сжигает верующих и священников». Потрясенные полицаи не тронули служителя Церкви. Слова священника потрясли и прихожан. Они говорили, что если уже священники взялись за оружие, то им сам Бог велит идти в партизаны.

В зону базирования группа отца Александра возвратилась с похорон, увеличенная во много раз. Среди нового партизанского пополнения были полицаи, но теперь уже бывшие. Всем участникам этих «похорон» Герой Советского Союза генерал-майор В.З. Корж объявил благодарность. Через некоторое время, перед строем партизан, отец Александр Романушко был награжден медалью «Партизану Отечественной войны» I степени.

Протоиерей отец Александр участвовал в партизанском движении с лета 1942 г. по лето 1944 г. Из его письма, посланного осенью 1944 г. митрополиту Алексию, следовало, что число священников в Полесской епархии уменьшилось на 55 %. Многие из них были расстреляны за содействие партизанам [8, с. 35–36].

Многие клирики Русской Православной Церкви, в годы Великой Отечественной войны, осуществлявшие свое пастырское служение на оккупированной врагом территории, получили государственные награды. Сотни священников совершали тогда геройские поступки, но многие имена забыты, или остались безвестными. Надеемся, что совместными усилиями и трудами удастся восстановить имена всех служителей Православной Церкви, с честью и достоинством выполнявших свой пастырский долг на землях нашего Отечества, временно занятых иноземными захватчиками.

В настоящее время взаимодействие и сотрудничество структур органов военного управления и Белорусской Православной Церкви приобретает особую важность в условиях укрепления государственного суверенитета Республики Беларусь. Возвращение воинства к истинно духовным, христианским и военно-патриотическим ценностям находит понимание и поддержку в Вооруженных Силах, других войсках и воинских формированиях Республики Беларусь. На современном этапе развития общества христианская религия, Православная Церковь по-прежнему остаются мощным фактором, оказывающим значительное влияние на все сферы общественной жизни, включая военную.

1. Савва, игумен. Слово главного редактора / Игумен Савва (Молчанов) // Вестник военного и морского духовенства. Спецвыпуск. – 2005. – С. 6–8.

2. Золотарев, О.В. Христолюбивое воинство русское /О.В. Золотарев. – М.: Граница, 1994.–110 с.

3. Шкаровский, М.В. Русская Православная Церковь при Сталине и Хрущеве (Государственно-церковные отношения в СССР в 1939–1964 годах) / М.В. Шкаровский – М: Издательский Дом «Грааль», 2000. – 400 с.

4. Коржич, Н. Вместе с народом Божиим. Православная Церковь в Белоруссии и патриотическая деятельность белорусского духовенства в 1941–

1944 гг. / Священник Николай Коржич // Материалы церковно-общественной конференции «За други своя». – Издательский Совет Русской Православной Церкви. – М.: 2005. – С. 87–96.

5. Вооруженные формирования Беларуси. К юбилеям великих побед / сост. Г.Ч. Лянькевич, И.И. Птуха; редкол.: В.В. Гайдукевич, А.А. Павловский [и др.]. – Минск: Беларусь, 2005. – 135 с.: ил.

6. Православное духовенство на временно оккупированных территориях (Материалы из архивов, публикаций, воспоминаний очевидцев) / Материалы церковно-общественной конференции «За други своя». – Издательский Совет Русской Православной Церкви. – М.: 2005. – С. 198–209.

7. Мартос, А. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни / Архиепископ Афанасий Мартос.– Минск: Издательство Белорусского Экзархата, 2000. – 352 с.

8. Силова, С.В. Крестный путь: Белорусская Православная Церковь в период немецкой оккупации 1941–1944 гг./С.В. Силова. – Минск: Издательство Белорусского Экзархата, 2004. – 72 с.

С.М. ТУКАЛА

## АЙЧЫННЫЯ І ЗАМЕЖНЫЯ КРЫНІЦЫ ПА МІНСКАМУ ГЕТА: ПАРАЎНАЎЧЫ АНАЛІЗ

Па шматлікім аспектам праблемы генацыду і барацьбы яўрэяў у мінскім гета (ліпень 1941 – кастрычнік 1943 г.) існуюць як неапублікаваныя архіўныя матэрыялы, так і разнастайныя апублікаваныя крыніцы. Аналізу апошніх і прысвечаны дадзены артыкул.

Апублікаваныя крыніцы па мінскаму гета можна падзяліць на наступныя групы: 1) матэрыялы справаводства. 2) статыстычныя матэрыялы. 3) крыніцы асабістага паходжання (дзённікі, успаміны, пісьма). 4) літаратурныя і публіцыстычныя творы. 5) перыядычны друк.

Матэрыялы справаводства ўключаюць апублікаваныя акты надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванню злачынстваў нямецкіх акупантаў, дакументы праціўніка – планы, загады, справаздачы, распараджэнні ўрадавых органаў і вышэйшага камандавання трэцяга рэйха. У дадзеным выпадку значную навуковую каштоўнасць для параўнаўчага аналізу ваенных падзей 1941–1944 гг. маюць шматлікія дакументы і матэрыялы аб акупацыйнай палітыкі фашысцкай Германіі на захопленай тэрыторыі СССР (у тым ліку Беларусі): “Преступления немецко–фашистских оккупантов в Беларуси” [1]; “Преступные цели – преступные средства...” [2]; “Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками” [3]; “Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими захватчиками в БССР” [4]–дадзеныя зборнікі савецкага часу ўключаюць сапраўдныя ўнікальныя

дакументы, аб'ектыўна выкрываючыя і дакладна характарызуючыя злачынныя дзеянні немцаў на тэрыторыі Беларусі: масавае знішчэнне мясцовага (у тым ліку яўрэйскага) насельніцтва ў Мінску і яго ваколіцах – мінскім гета і трасцянецкім лагеры смерці; рабаванне і вываз у Германію нацыянальных багаццяў нашай краіны; маштабнае разбурэнне матэрыяльных аб'ектаў і сусветна вядомых гісторыка-культурных помнікаў; мэты, задачы, змест і трагічныя вынікі праводзімай немцамі чалавеканенавісніцкай, антысеміцкай палітыкі генацыду на тэрыторыі БССР.

Да першай групы крыніц адносяцца і сучасныя зборнікі дакументаў, прычым значная іх колькасць раней не публікавалася: "Холокост в Беларуси. 1941–1944" [5] (уключае справаводчыя дакументы і матэрыялы аб злачынствах нямецка–фашысцкіх захопнікаў супраць яўрэйскага насельніцтва на беларускай зямлі); "Трагедия евреев Беларуси в 1941 – 1944 гг."[6] (тут упершыню прадстаўлены кароткі спіс яўрэяў Мінскага гета); "Judenfrei! Свободно от евреев: История Минского гетто в документах" [7] (дадзеная кніга змяшчае не толькі нямецкія дакументы па генацыду яўрэяў, але і вялікую колькасць успамінаў падпольшчыкаў гета, якія пасля вайны былі дапытаны прадстаўнікамі савецкіх урадавых органаў: аб афармленні арганізацыйнага падпольнага цэнтру Мінскага гета ў жніўні 1941 г. і намаганнях падпольшчыка М. Гебелева ў ажыццяўленні гэтага амбіцыйнага плана, станаўленні падпольных груповак і іх ролі ў актывізацыі падпольнага і партызанскага руху ў Беларусі, сувязях гетаўскіх падпольшчыкаў з Мінскім патрыятычным падполлем і партызанамі па–за межамі Мінска); "Лагерь смерти Тростенец ..." (налічвае не менш 41 дакумента па сталічнаму гета) [8].

Напрыклад, у зборніку "Холокост в Беларуси. 1941–1944" па Мінскаму гета маецца 48 дакументаў як палітычнага, так і эканамічнага характару: распараджэнні камісара Мінска аб працавыкарыстанні яўрэяў; рэйхскамісара Остланда аб выкарыстанні адзення і маёмасці, канфіскаванага ў яўрэйскага насельніцтва; пратакол бяседы ст. памочніка начальніка разведаддзела БШПР Н. А. Касога з вязнем Мінскага гета Х.І. Рубінчык, якая падрабязна і ўзвешана апавядае аб першасных мерапрыемствах немцаў у адносінах да яўрэйскага насельніцтва г. Мінска ў першыя дні акупацыі, аб унутраным распарадку і адміністрацыі гета, фактах і метадах знішчэння жыхароў лагера, дэпартацыі гамбургскіх яўрэяў у Мінскае гета і іх далейшым лёсе. Не менш цікавымі ў дакументальным плане з'яўляюцца пратакол допыту былога вязня гета Я.Р. Шапіра (у якасці сведкі па справе В. Янецке на судовым працэсе ў Бабруйску), які ўзгадвае розныя моманты з жыцця яўрэяў Мінска ў гады нямецкай акупацыі і акцэнтуе сваю ўвагу на асаблівасцях правядзення фашыстамі масавых пагромаў, а таксама паказанні нямецкага ваеннапалоннага А. Абтса, які непасрэдна прымаў удзел у канчатковай ліквідацыі Мінскага гета ў кастрычніку 1943 г.

Неабходныя абагульняючыя дадзеныя справаводчага характару па Мінскаму гета можна знайсці і ў замежных зборніках дакументаў і матэрыялаў.

Першае месца сярод такіх выданняў займае “Черная книга...” [9] – зборнік матэрыялаў аб знішчэнні яўрэяў на тэрыторыі СССР і ў лагерах Польшчы ў 1941–1945 гг., які падрыхтавалі да друку і рэдагавалі І. Эрэнбург і В. Гросман. У кнізе ў навукова–папулярнай форме да шырокай грамадскасці даносяцца асноўныя дакументальныя звесткі аб генацыду і барацьбе яўрэяў у Мінскім гета.

Карысную інфармацыю змяшчае таксама зборнік дакументаў і матэрыялаў Нацыянальнага інстытута Памяці ахвяр нацызму і герояў Супраціўлення – “Уничтожение евреев СССР в годы немецкой оккупации (1941–1944)” [10].

Статыстычныя матэрыялы па разглядаемай праблеме характарызуюцца паўнатой, дакладнасцю, наяўнасцю масавых і колькасных дадзеных. Заслугоўвае ўвагі кніга “Нямецка–фашысцкі генацыд на Беларусі”(1941–1944) [11], у якой прыведзены ўдакладненыя і дапоўненыя статыстычныя звесткі і новы фактычны матэрыял аб акупацыйнай палітыкі захопнікаў на тэрыторыі Беларусі. Разам з гэтай кнігай – крыніцай (убачыла свет у 1995 г.) трэба адзначыць унікальны нарыс аб гісторыі Мінскага падполля (у тым ліку на тэрыторыі сталічнага гета), дзе змешчаны арыгінальныя малавядомыя і невядомыя дакументы – “Мінскае антыфашысцкае падполле” [12]. Толькі ў гэтым выданні ёсць поўны, дасканалы спіс усіх 22 падпольных груповак, іх прадстаўнікоў, масавыя дадзеныя аб асноўных задачах апошніх, якія дзейнічалі на тэрыторыі Мінскага гета ў 1941–1943 гг., цікавыя статыстычныя звесткі аб канспіратыўных кватэрах і г.д. Вельмі карысным з’яўляецца даведнік аб нямецка-фашысцкіх лагерах, гета, іншых месцах прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941–1943 гг., які змяшчае дадзеныя аб колькасці вязняў і знішчаных яўрэяў Мінскага гета.

Важна падкрэсліць значнасць і інфарматыўнасць нетрадыцыйных крыніц асабістага паходжання – дзеннікі, успаміны сведкаў Халакосту і жудаснай палітыкі генацыду яўрэяў у гады Другой сусветнай вайны. Безумоўна, яны напісаны ў розны час, аб розных падзеях ваенных гадоў, часам маюць гістарычныя недакладнасці і нясуць на сабе сляды суб’ектыўных пачуццяў, цяжкіх маральных, псіхалагічных перажыванняў ахвяраў вайны. І гэта зразумела. Аднак трэба памятаць, што такія крыніцы на сённяшні дзень з’яўляюцца, бадай, адзінымі больш-менш дэталёвымі дакументальнымі аповедамі выжыўшых людзей, якія бачылі ўласнымі вачыма, адчулі на сабе фізічна і моцна духоўна ўсе негатыўныя жахі нацызму, антысемітызму, генацыду, Халакосту і крывавай машыны вайны. Таму ў дадзеным выпадку асноўная задача даследчыка – аб’ектыўны аналіз гэтых асабістых успамінаў дзеля раскрыцця галоўнага зместу і сутнасці закладзенай у дакуменце інфармацыі.

Аб’емныя і даволі маштабныя ўспаміны былі напісаны Р. Смолярам, які вырашыў кардынальна перапрацаваць сваю кнігу “Мстители гетто” і па-новаму,

максімальна праўдзіва адлюстраваць усю гісторыю Мінскага гета ад пачатку да канца. Тым больш, што настаў час, калі ўжо можна было казаць усю праўду пра яўрэйскае гета. У 1989 г. успаміны Смоляра на англійскай мове выйшлі ў ЗША [13]. У 2002 г. яны былі перакладзены на беларускую мову і дайшлі да чытача пад наступнай назвай: "Менскае гета: барацьба савецкіх габраяў – партызан супраць нацыстаў" [14]. Дадзеная кніга ўяўляе вялікую цікавасць як жывое сведчанне аднаго з нешматлікіх уцалелых у сталічным гета яўрэяў. Успамінам Смоляра ўласцівы характэрныя рысы дэталёвага навуковага даследавання: аўтар, з'яўляючыся адным са спецыялістаў у галіне гетазнаўства, аналізуе гісторыю Мінскага гета ў кантэксце агульнаеўрапейскай палітыкі нацыстаў адносна яўрэяў, спрабуе праліць святло на такія маладаследаваныя моманты як устанаўленне кантактаў гетаўскага *падполля з пазагетаўскім* – Мінскім падпольным гарадскім камітэтам камуністычнай партыі, адносіны яўрэйскіх партызанаў з Цэнтральным штабам партызанскага руху і г.д. Таксама ў якасці дапаўняючага матэрыялу трэба спаслацца на публікацыю Р. Смоляра ў часопісе "Полымя" пад назвай – "Антыфашысцкае падполле ў мінскім гета (ліпень 1941–жнівень 1942 гг. )" [15].

Каштоўнымі і дакументальна насычанымі сталі ўспаміны І. Вайца, А. Гальбурта, Г. Краснаперкі, С. Марголінай, А. Лапідуса, Г. Завольнер і інш. [16].

Рэдкім і цудам уцалелым з'яўляецца дзённік аб жыцці і далейшым лёсе вязняў гета К. і Б. Брук "Когда слова кричат и плачут: дневники Брук Л. и Б" [17], якія сталі актыўнымі ўдзельнікамі партызанскай барацьбы на Беларусі.

Не менш важнае значэнне маюць апублікаваныя інтэрв'ю былых вязняў Мінскага гета М. Трэйсцера, Х. Рубінчык, М. Бруднера, Я. Шапіра, Ц. Батвіннік – Луп'ян, С. Гебелевай – Асташынскай, Р. Ліпскай, Г. Мачыз, Р. Гітлінай, М. Гарэліка, С. Голуба, Я. Грынштэйна, Л. Рубінштэйна, Л. Меламеда, М. Шмелькіна і інш [18]. Так, успаміны М. Трэйсцера [19] на ўласным прыкладзе аўтара яскрава, дакладна, праўдзіва, шчыра характарызуюць сапраўднае псіхалагічнае становішча вязняў Мінскага гета падчас праводзімых немцамі аблаваў, начных і дзённых пагромаў, масавых забойстваў жыхароў гета.

Па складанай праблеме дэпартацыі грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці краін Заходняй Еўропы ў "зондэргета" Мінскага гета існуюць вельмі рэдкія дакументальныя фрагменты Б. Срэбніка, Л. Меламеда, Л. Ланскога, А. Дамашэвіча, Р. Кантара, З. Вінера, П. Добіна і інш. [20].

Быў праведзены аналіз шматлікіх пратакольных запісаў аб дзейнасці выканаўцаў злачынстваў, накіраваных супраць яўрэяў, формах і метадах іх знішчэння. Гэта паказанні супрацоўнікаў паліцыі бяспекі і СД у Мінску І. Айгемана, І. Руіса, Э. Фрыдла, К. Бухнера, служачага зондэркаманды № 8 Ф.К. Геса, камандуючага паліцыяй бяспекі генеральнай акругі Беларусь Э. Герфа, мінскага гарадскога камісара В. Янецке і інш. [21].

Вялікую ролю ў адлюстраванні трагічных старонак па Мінскаму гета адыгрываюць успаміны, пісьмовыя сведчанні, дзеннікі дэпартаваных замежных

яўрэяў, якія таксама сталі ахвярамі агульнаеўрапейскай палітыкі генацыду і прайшлі праз неймаверныя пакуты яўрэйскага гета ў Мінску. Найбольш раннія– гэта ўспаміны нямецкага вязня К. Левенштайна аб дэпартацыі і яго знаходжанні ў Мінскім гета [22]. Упершыню яны былі апублікаваны ў 1956 г. Другім апублікаваным дакументам з'яўляецца кніга гамбургскага яўрэя Х. Розенберга пад назвай "Годы ужаса... и я остался жить, чтобы тебе это все рассказать" [23].

Аднак самым цікавым і важным, мяркуецца, з'яўляецца дзённік дэпартаванага з Бярліна аўстрыйскага яўрэя Б. Руднера [24]. Запісы пачынаюцца непасрэдна з дэпартацыі і нечакана абрываюцца ў чэрвені 1942 г. Руднер падрабязна апісвае цяжкі і доўгі працэс падрыхтоўкі высялення яўрэяў і адпраўкі іх на Усход, складаную сітуацыю, якая панавала ў Мінскім гета па прыбыццю ў Мінск і на працягу свайго знаходжання ў "зондэргета": псіхалагічная прыгнечанасць мясцовых вязняў, крыкі, плач дзяцей, нявызначанасць, антысанітарныя, нечалавечыя ўмовы існавання, адсутнасць элементарных прыстасаванняў для нармальнага пражывання і харчавання. Значную ўвагу аўтар акцэнтуе на асаблівасцях нялегкіх узаемаадносін нямецкіх і мясцовых яўрэяў, падрабязна паказваючы ўсе характэрныя бакі такіх кантактаў. Значнасць дзённіка Б. Руднера ў тым, што ў дадзенай крыніцы асноўныя падзеі фіксуюцца па свежых слядах, тым самым захоўваецца храналагічная і гістарычная дакладнасць.

Літаратурныя і публіцыстычныя творы па Мінскаму гета маюць багатую дакументальную аснову і насычаны цікавымі гістарычнымі фактамі. Напрыклад, "Правда о Минском гетто" – гэта дакументальная аповесць, напісаная А. Рубенчыкам – былым воінам–партызанам, сведкай тых жудасных падзей вайны, які, дзякуючы ўласнай упартасці, храбрасці, непахіснасці, выжыў у страшэнных умовах Мінскага гета. Галоўная каштоўнасць кнігі заключаецца ў тым, што яе аўтар піша шчыра і праўдзіва, не скажаючы гістарычных фактаў.

Арыгінальныя матэрыялы былых малалетніх вязняў Мінскага гета М. Крапінай і Ф. Рэйзман [25], у аснове апавядання якіх дакументальная гісторыя сямейнага жыцця, пакут і барацьбы за выратаванне ва ўмовах нямецкай акупацыі і за сценамі яўрэйскага гета, паказваюць самыя розныя бакі жыцця яўрэяў: правядзенне аблаваў і пагромаў, дзеці гета ва ўмовах голаду, хваробаў і антысанітарыі, спосабы выжывання вязняў і г.д.

Нельга не адзначыць унікальную па свайму зместу працу савецкіх часоў, у якой утрымліваецца шмат цікавых фактаў аб дзейнасці падпольшчыкаў гета і іх сувязях з мінскім гарадскім падполлем. Гэта дакументальная аповесць савецкага журналіста І. Новікава "Руины стреляют в упор" [26]. Апошняя не мала ўвагі ўдзяляе апісанню ролі гетаўскага падпольшчыка Р. Смоляра ва ўстанаўленні прамых кантактаў з прадстаўнікамі Мінскага падпольнага гаркама КПБ.

Абагульненыя, базісныя звесткі аб генацыду яўрэяў у Мінскім гета можна знайсці ў шматлікіх выданнях перыядычнага друку, у такіх газетах і навуковых часопісах як "Авив", "Вечерний Минск", "Звязда", "Советская Белоруссия",

"Рэспубліка", "Минский курьер", "Спадчына", "Беларусь", "Вопросы истории", "Беларуская мінуўшчына", "Беларускі гістарычны часопіс" і іншыя. Найбольш актыўна і падрабязна, на аснове гістарычных дакументаў, праблематыка Халакосту і генацыду яўрэяў Мінскага гета разглядаецца ў газеце "Авив", публікацыі якой прысвечаны асаблівасцям існавання яўрэйскага гета, дзейнасці яўрэйскага камітэта, антыфашысцкага падполля і г.д. [27].


1. Преступления немецко – фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941 – 1944: сб. док. и мат./ И.П. Хавратович [и др.]; под. общ. ред. И. П. Хавратовича. – Минск: Гос. издат. БССР, 1963. – 436 с.

2. Преступные цели – преступные средства: док. об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941 – 1944 гг. ) / сост. Г.Ф. Заставенко. – Москва: Экономика, 1985. – 325 с.

3. Нюрнбергский процесс: сб. мат. в 2 т. – Москва: Гос. издат., 1955. – Т. 1. – 935 с.

4. Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко – фашистскими захватчиками в Белорусской ССР (15 – 29 января 1946 г. ). – Минск: Гос. изд – во БССР, 1947. – 472 с.

5. Холокост в Беларуси. 1941–1944. Документы и материалы / Нац. архив Респ. Беларусь; редкол.: В.И. Адамушко [и др.]. – Минск: НАРБ, 2002. – 275 с.

6. Трагедия евреев Беларуси в годы немецкой оккупации (1941 – 1944 гг.): сб. матер. и док. / сост. Р.А.Черноглазова, А.Т. Лейзеров. – Минск: Гальперин, 1995. – 362 с.

7. Judenfrei! Свободно от евреев: История Минского гетто в документах / сост. Р. А. Черноглазова. – Минск: Асобны дах, 1999. – 395 с.

8. Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы / Ком. по архивам и делопроизводству при Совете Министров Респ. Беларусь; редкол.: В.И. Адамушко [и др.]. – Минск: НАРБ, 2003. – 292 с.

9. Гроссман, В. Черная книга: о злодейском повсеместном убийстве евреев немецко – фашистскими захватчиками во временно оккупированных районах Сов. Союза и в лагерях Польши во время войны 1941-1945 / В. Гроссман, И. Эренбург. – Вильнюс: Йад, 1993. – 578 с.

10.Уничтожение евреев СССР в годы немецкой оккупации (1941 – 1944): сб. док. и мат. / Яд Ва-Шем. Национальный институт Памяти жертв нацизма и героев Сопротивления. – Иерусалим, 1991.

11. Нямецка – фашысцкі генацыд на Беларусі (1941 – 1944) / Белар. н.-д. цэнтр дакументазнаўства, археаграфіі і арх. справы; рэдкал.: У.М. Міхнюк [і інш.]. – Мінск: БелНДЦДААС, 1995. – 411 с.

12. Мінскае антыфашысцкае падполле / Я. І. Бараноўскі [і інш.]; пад агульн. рэд. Я.І. Бараноўскага. – Мінск: Беларусь, 1995. – 256 с.

13. Smolar, H. The Minsk Ghetto. Soviet – Jewich Partisans Against the Nazis / H. Smolar. – New York, 1989.

14. Смоляр, Г. Менскае гета: барацьба савецкіх габраяў – партызанаў супраць нацыстаў / Г. Смоляр. – Мінск: Тэхналогія, 2002. – 182 с.

15. Смоляр, Р. Антыфашысцкае падполле ў мінскім гета (ліпень 1941 – жнівень 1942 г.) // Полымя. – 1995. – № 6. – С. 208 – 244.

16. Вайц, И. Ликвидация минского гетто / И. Вайц // Катастрофа европейского еврейства / И. Вайц. – Тель – Авив, 2000. – Гл. 7. – С. 117-120; Гальбурт, А. Воспоминания / А. Гальбурт. – Минск: Энциклопедикс, 2000. – 64 с; Краснаперка, Г. Пісьмы маей памяці / Г. Краснаперка. – Мінск, 1984; Krasnoperko, A. Briefe meiner Erinnerung. Mein Überleben im jüdischen Ghetto von Minsk 1941/ 1942 / A. Krasnoperko. – Haus Villigst, 1991; Давыдова, Г.Р. От Минска до Ла-Манша, или Дорогами Холокоста: Документальная повесть / Г.Р. Давыдова. – Минск: Четыре четверти, 2000. – 232 с; Лапидус, А. Нас мало осталось, нам много досталось: (Воспоминания бывшего малолет. узника гетто ) / А. Лапидус // Вестник. – 2003. – №3; Рубенчик, А. Правда о Минском гетто: док. повесть узника гетто и малолетнего партизана / А. Рубенчик. – Тель-Авив, 1999. – 192 с; Завольнер, Г. Жизнь, дарованная судьбой / Г. Завольнер. – Минск, 2005.

17. Когда слова кричат и плачут: дневники Брук Л. и Б. – Минск, 2004.

18. Гебелева, С. Таким был Михаил Гебелев: [Об участнике Минского подполья] / С. Гебелева // Авив. – 1993. – 19 окт. – С. 3, 6; Минское гетто: [По воспоминаниям бывших узников] / В. Левин, Д. Мельцер // Черная книга с красными страницами: Трагедия и героизм евреев Белоруссии / В. Левин, Д. Мельцер. – Балтимор, 1996. – С. 343 – 414.

19. Трейстер, М. Минское гетто. Проблески памяти / М. Трейстер // Актуальные вопросы изучения Холокоста на территории Беларуси в годы немецко-фашистской оккупации: сб. науч. раб. / Истор. мастер. г. Минска, Дортмунд. межд. образ. центр; редкол.: Я.З.Басин [и др.]. – Минск, 2005. – С. 79 – 88; Трейстер, М. Проблески памяти. Воспоминания, размышления, публикации / М. Трейстер. – Минск: Ист. мастерская, 2007. – 242 с.

20. Левкова, Е. Девять месяцев под землей / Е. Левкова // Мінскае гета. 1941–1943 гг.: Трагедыя. Гераізм. Памяць. Матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 24 каст. 2003 г. / Гіст. майст. г. Мінска; рэдкал.: К. І. Козак [і інш.]. – Мінск, 2003. – С. 189.

21. "У сваіх справаздачах я ніколі не паведамляў аб расстрэлах яўрэяў, а пісаў пра іх адсяленне альбо пераезд. Гэта быў наш умоўны шыфр... " (па Мінскаму гета: дак. архіваў КДБ ) // Беларусь. – 1994. – № 8. – С. 6 – 7.

22. Loewenstein, K. Minsk, im Lager der deutschen Juden / K. Loewenstein. – Bonn, 1961.

23. Rosenberg, H. Jahre des Schreckens. ... und ich blieb übrig, das ich Dir's ansage / H. Rosenberg. – Göttingen, 1985.

24. Руднер, Б. Дневник из Минского гетто (ноябрь 1941 – июнь 1942) / Б. Руднер // Беларусь у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны: масавыя забойствы нацыстаў: матэрыялы Міжнар. навук.- практ. канф., Мінск, 2 ліп.

2004 г. / Гіст. майст. г. Мінска; рэдкал.: У.Ф. Балакіраў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 202 – 219; Руднер, Б. Записки из Минского гетто. Памяти Марты Крон, умершей 26 января 1942 г. в 18 часов в Минском гетто. Рассказ о последних трех месяцах жизни (12.11. 1941 – 26.1. 1942) / Б. Руднер // Беларусь у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны: масавыя забойствы нацыстаў: матэрыялы Міжнар. навук.- практ. канф., Мінск, 2 ліп. 2004 г. / Гіст. майст. г. Мінска; рэдкал.: У.Ф. Балакіраў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 220 – 225.

25. Жива... Да, я жива! Минское гетто в воспоминаниях Майи Крапиной и Фриды Рейзман: материалы и док. / сост. М.И. Крапина, Ф.В. Рейзман; под ред. К.И. Козака. – Минск, 2005. – 258 с. + 26 с. ил.

26. Новиков, И. Руины стреляют в упор. Документальная повесть / И. Новиков. – Минск: Беларусь, 1965. – 464 с.

27. Жизнь и гибель Минского гетто (Публикация Музея истории и культуры евреев Беларуси) // Авив. – 2003. – 19 окт. – С. 4; Лейзеров, А. «Из фондов [Минского] гетто»: [По материалам арх. док. оккупац. властей] / А. Лейзеров // Авив. – 2000. – 19 июля – 19 августа. – С. 14-15; Липский, Ф. Герой и летописец Минского гетто: [Памяти Смоляра Г., рук. Сопротивления в Минском гетто] / Ф. Липский // Авив. – 1993. – 19 марта. – С. 15.

# РАЗДЕЛ 3. ПАРТИЗАНСКАЯ И ПОДПОЛЬНАЯ БОРЬБА

В.Я. БЕЗДЗЕЛЬ

## ВЫРАТАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ ПАРТЫЗАНАМІ І ПАДПОЛЬШЧЫКАМІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Зараджэнне і станаўленне партызанскага і падпольнага руху на тэрыторыі Беларусі адносіцца да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Асноўныя задачы і мэты руху супраціву былі акрэслены ў прамове І. Сталіна, а затым дакументах ЦК КП(б)Б, у прыватнасці, у дырэктыве № 2 ад 1 ліпеня 1941 г. Патрабаванні зводзіліся да стварэння невыносных умоў для ворага ў яго ўласным тыле. З узмацненнем руху супраціву, павелічэннем колькасці партызанскіх шэрагаў, пашырэннем дзейнасці падполля патрыятычныя партыйныя, камсамольскія органы, партызанскія фарміраванні змаглі ўзяць на сябе функцыі па абароне і выратаванні жыцця дзяцей, а пазней і выхаваўчыя. Ужо з 1943 г., калі партызаны кантралявалі прыкладна 60% тэрыторыі Беларусі, можна гаварыць аб тым, што нараўне з баявымі задачамі па зрыву планаў акупантаў, прымаліся меры па захаванні жыцця беларускіх дзяцей, што з'яўлялася ў сваю чаргу адной з састаўляючых комплексу мерапрыемстваў па захаванні насельніцтва ад знішчэння акупантамі і вывазу яго ў Германію.

Важнае значэнне меў і асабісты фактар. Па прызнанні многіх камандзіраў партызанскіх атрадаў, шараговых партызан, дзеці, асабліва тыя, што былі задзейнічаны ў баявых аперацыях, станавіліся “любімчыкамі” ў атрадах. Зразумела, што дарослыя мужчыны імкнуліся зберагчы іх не толькі таму, што яны значна саступалі па ўзросту, але і таму, што ў многіх з іх у акупаваных вёсках таксама засталіся дзеткі.

У першую чаргу ўвагу звярнулі на дзяцей, што засталіся без бацькоў, знаходзіліся ў дзіцячых установах, бадзяжнічалі. Адной з прычын такой пільнай увагі сталі сувязі выхавацеляў з патрыятычным падполлем і партызанамі, існаванне ў многіх дзетдамах падпольных груп, у большасці выпадкаў з удзелам у іх дзяцей старэйшага ўзросту. Ведаючы аб гаротным становішчы выхаванцаў такіх устаноў (голад, холад, адсутнасць медыцынскага абслугоўвання), падпольшчыкі бралі іх пад свой кантроль і ўсемагчымымі сродкамі дапамагалі дзецям. Спектр сродкаў дапамогі быў розным: ад нелегальных шляхоў пастаўкі прадуктаў харчавання да прыкрыцця такіх паставак акупацыйнымі разнарадкамі і дазволамі. Так, Браслаўскі дом немаўляці фінансаваўся за кошт гарадской управы па ўказанні старасты А.А. Васілеўскага, які займаў гэты пост па заданні гарадскога падполля. У яго абавязкі ўваходзіла арганізоўваць збор прадуктаў харчавання сярод насельніцтва і папярэджваць выкарыстанне дзяцей у якасці донараў [1, с. 387]. Восенню 1943 г. пасля арышту А.А. Васілеўскага дзетдом перадалі на ўтрыманне Браслаўскай БНС. Каб не дапусціць выкарыстання

перадалі на ўтрыманне Браслаўскай БНС. Каб не дапусціць выкарыстання дзяцей у медыцынскіх мэтах, падпольшчыкі пусцілі чуткі аб тым, што дзеці хворыя на сухоты.

У тых раёнах, дзе нямецкія гарнізоны былі менш колькасныя, патызаны прыбягалі да метадаў індывідуальнага тэрору. Маецца на ўвазе запугванне дырэктароў дзіцячых устаноў, дапаможнай адміністрацыі. Так адбылося ў выпадку з дзятлаўскім бургамістрам.

Сярод дзетдамоў, што апекаваліся падпольшчыкамі і партызанамі ў гады акупацыі, можна назваць Наваельненскі прытулак (антыфашысцкая група пад кіраўніцтвам Т. Умновай), Гомельскі (доктарам там працаваў член гомельскай падпольнай камсамольскай арганізацыі), дзетдом у Карэлічах, у в. Быкаўшчына Полацкага раёна (партызанская брыгада "Няўлоўныя" пад кіраўніцтвам М.С. Пруднікава) [2]. Дадзеныя аб аказанні дапамогі беспрытульным дзецям маюцца ў архіўных дакументах, справаздачах падпольных партыйных і камсамольскіх органаў, аднак яны носяць фрагментарны і неінфарматыўны характар [3, арк. 34].

У шэрагу выпадкаў партызанам нават удалося вывезці дзетдамы ў партызанскія зоны. На дадзены момант вядома аб двух такіх выпадках: аперацыя "Зорачка" (вываз Полацкага дзетдома) і "Дзеці" (вываз прытулку з Сёмкаў Гарадка). Абедзве акцыі былі праведзены зімой–вясной 1944 г. Неабходна адзначыць, што вывезці дзяцей з тэрыторыі, падкантрольнай акупантам, партызан прымусілі абставіны. Па прызнанні І. Фёдарава, камісара партызанскай брыгады "Штурмавая", якая адказвала за выратаванне выхаванцаў Сёмкаў-Гарадоцкага прытулку, размяшчэнне вялікай колькасці дзяцей (274 чал.) у партызанскіх атрадах "моцна адбілася б на рухомасці і мабільнасці атрадаў, а гэта значыць і на іх баяздольнасці" [4, с. 155]. Гэта было, на наш погляд, галоўнай прычынай, па якой такіх аперацый было толькі дзве, бо і іншыя дзетдамы рэспублікі не мелі сродкаў да існавання.

Штуршком да прыняцця непрастога рашэння аб эвакуацыі дзяцей стала пагроза іх жыццю: фашысты планавалі выкарыстаць дзяцей у якасці донараў і вывезці іх у Германію. Нагадаем, што зімой 1944 г. савецка-германскі фронт стабілізаваўся на тэрыторыі ўсходняй Беларусі. Нямецкая армія адступала і не толькі рабавала беларускія тэрыторыі, але і вывозіла насельніцтва, у тым ліку і дзяцей, у Германію. Таму пагроза для дзіцячых устаноў была сур'ёзная. Наладжаныя да гэтага моцныя сувязі паміж выхавацелямі і партызанамі дазволілі своечасова прыняць меры і папярэдзіць акупантаў.

Аперацыя "Зорачка" па вывазу Полацкага дзетдома адбылася ў ноч на 19 лютага 1944 г. У штабе Полацка-Лепельскага партызанскага злучэння быў загадзя распрацаваны падрабязны план аперацыі. Галоўнай умовай паспяховай рэалізацыі плана стала правядзенне аперацыі без баявых дзеянняў, што дазволіла, па ўспамінах кіраўніка злучэння В.Е. Лабанка, "захаваць жыццё кожнага дзіцяці" [5, с. 309]. Магчымасць уступлення ў бой таксама прадугледжвалася. Для гэтага былі задзейнічаны сілы двух атрадаў брыгады імя Чапаева пад агульным кіраўніцтвам Б.П. Алешчанкі. На 30 падводах у

партызанскую в. Славені прывезлі 130 дзяцей ва ўзросце ад 5 месяцаў да 15 гадоў, абслугоўваючага персанала – 20 чалавек, харчавання, маёмасці і транспарта – 3 павозкі і 6 кароў [6, арк. 54].

Выратаваць дзяцей і перавезці на кантралюемую партызанамі тэрыторыю – не гэта задача была для кіраўніцтва партызанскім злучэннем самая складаная. З гэтага моманту праблемы па забеспячэнні дзяцей харчаваннем, адзеннем, іх выхаванне цалкам клаліся на плечы партызан, што, канешне ж, значна абмяжоўвала іх сілы ў выпадку блакады партызанскай зоны і сутыкненні з ворагам. Для вырашэння ўзнікшых цяжкасцяў бюро Ушацкага падпольнага РК КП(б)Б на пасяджэнні 20–25 лютага 1944 г. пастанавіла не ліквідоўваць дзетдом як арганізацыйную структуру, а перайменаваць яго ў "дзіцячы дом партызанскай брыгады імя Чапаева". Штат педагогаў застаўся ранейшым, як і колькасць выхаванцаў [7, арк. 40 зв.]. На жаль, звестак аб далейшым жыцці і забеспячэнні дзяцей намі знойдзена вельмі мала. Па ўспамінах партызан і выхавацеляў, дзеці атрымлівалі ўсё самае лепшае, што можна было даць ва ўмовах існавання ў тыле германскай арміі. Старэйшыя былі задзейнічаны на абслугоўванні партызанскага аэрадрому "Вячэлле". Пад пагрозай блакады Полацка-Лепельскай зоны дзяцей па папярэдняй дамоўленасці з Масквой пераправілі на Вялікую зямлю. Дзіцячы дом спыніў сваё існаванне.

План па выратаванні выхаванцаў Сёмкаў-Гарадоцкага прытулку Мінскай вобласці распрацоўвалі Заслаўскі падпольны РК КП(б)Б і камандаванне партызанскай брыгады "Штурмавая". Сярод сур'ёзных перашкод, якія ў першую чаргу неабходна было вырашыць, – гэта недахоп ці поўная адсутнасць цёплага адзення ў дзяцей і наяўнасць цэлай сістэмы варожых гарнізонаў, такіх як мінскі, масюкоўшчынскі, ратамскі, змееўскі, заслаўскі, на шляху вывазу дзяцей. У ноч на 29 сакавіка 1944 г. 274 выхаванцы прытулку больш як на 60 падводах былі вывезены партызанамі ў в. Сярэдняе (Манылы). Ахову абоза ўзначальваў камандзір першай роты атрада ім. Жукава І.І. Бацян (у некаторых крыніцах – І.І. Бацянка).

На нарадзе камісараў і камандзіраў партызанскіх атрадаў было вырашана не арганізоўваць дзетдом, а ўладкаваць дзяцей у сем'і мясцовага насельніцтва. Улічваючы вялікую колькасць выхаванцаў, для кожнага атрада былі ўведзены спецыяльныя нормы па размяшчэнні дзяцей. На камандзіраў ускладвалася адказнасць за правядзенне медагляду і санапрацоўкі кожнага дзіцяці. Сярод насельніцтва прапаноўвалася правесці тлумачальную працу аб неабходнасці прыняць беспрытульных. Кантроль за жыццём дзяцей у прыёмных сем'ях павінны былі ажыццяўляць партызаны [8, арк. 218; 9, с. 217]. Па ўспамінах І. Фёдарава, у час блакады партызан у маі 1944 г. ніводная сям'я не пакінула прынятых дзяцей. Наадварот, многія з іх засталіся жыць з прыёмнымі бацькамі і пасля вайны [4, с. 157].

У цяжкіх умовах апынуліся дзеці ў гета. Складанасць у аказанні дапамогі заключалася ў ізаляванасці і ахове гета. Разам з тым, і там дзейнічалі падпольныя групы. Адной з задач падпольшчыкаў быў вывад людзей у

бяспечныя раёны. Так, з мінскага гета ў партызанскую зону Мінскага раёна яўрэяў выводзіў І. Левін, дарэчы, падлетак па ўзросце. У час апошняга пагрома (восень 1943 г.) ім была выведзена група падлеткаў 10 – 12-ці гадоў, сярод якіх і яго сястра Мая. Дзеці былі паспяхова дастаўлены ім у Пухавіцкі раён да партызан [10, с. 59]. Апошнія спрабавалі стварыць дзетдом для выратаваных дзяцей. Аднак з-за складанай ваеннай абстаноўкі камандаванне 2-й Мінскай партызанскай брыгады вымушана было размеркаваць больш за 40 дзяцей сярод жыхароў в. Парэчча. Па ўспамінах М. Левінай, насельніцтва прымала іх не з вялікай ахвотай. У дадзеным выпадку прыняцце яўрэйскіх дзяцей абцяжарвалася пытаннем уласнай бяспекі, асабліва пры блакадзе партызанскай зоны. Разам з тым, усе былі ўладкаваны і пражылі па сем'ях да прыходу Чырвонай Арміі.

Вышэй намі неаднаразова падкрэслівалася, што камандаванне партызанскімі фарміраваннямі неахвотна прымала ў атрады небаяздольнае насельніцтва, асабліва дзяцей. Адзіным выключэннем, якое дзейнічала заўсёды, было пагроза жыццю сям'і партызана ці падпольшчыка, жыццю дзіцяці-падпольшчыка. У гэтым выпадку іх па магчымасці выводзілі ў бяспечную зону. Беспрэцэдэнтным можна назваць выратаванне партызанамі і падпольшчыкамі дзяцей палітэмігрантаў, якія засталіся пад акупацыяй у Наваельнінскім прытулку. Па загадзе камандзіра атрада "Кастрычніцкі" А. Рэдзькі былі вывезены і размешчаны па сялянскіх сем'ях італьянка П. Глікозіо, чэшка У. Рэняк, полька К. Александрук і іншыя дзеці [2, с. 187].

Неабходна адзначыць, што рэгулярнае забеспячэнне размеркаваных па сем'ях дзяцей, якія былі выратаваны (ва ўсіх пералічаных вышэй выпадках), партызанамі не прадугледжвалася. Дапамога аказвалася толькі тым сем'ям, у якіх узнікалі цяжкасці. Зразумела, паколькі само насельніцтва і з'яўлялася першай крыніцай папаўнення партызанскіх запасаў харчавання. Такім чынам, нягледзячы на тое, што аперацыі партызан па выратаванні дзяцей сталі магчымымі пасля ўзмацнення партызанскага руху, асноўны цяжар па далейшым забеспячэнні і адказнасці за дзяцей клаўся на плечы мясцовых жыхароў. Набліжэнне лініі фронту і пагаршэнне сітуацыі ў большасці дзіцячых устаноў, што дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі, патрабавала неадкладных рашэнняў. Не заўсёды партызанскія фарміраванні мелі дастаткова рэсурсаў для правядзення такіх аперацый, не было спрыяльных абставін, аднак дзяцей па магчымасці ратавалі. Часцей за ўсё іх перавозілі ў больш бяспечныя вёскі, хавалі па лясах, карыстаючыся тым, што ў акупацыйных улад ва ўмовах адступлення не было часу займацца пытаннямі беспрытульных дзяцей і высылаць за імі дадатковыя вайсковыя часткі. Выратаваныя сотні жыццяў беларускіх дзяцей – гэта вынік не толькі рашучасці і сілы беларускіх партызан, але і мясцовага мірнага насельніцтва.

1. Люди нарочанского края. Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. – Мн.: Беларусь, 1975. – 592 с.

2. Паўлаў, У.П. Дзеці ліхалецця / У.П. Паўлаў. – Мн.: ААТ "Паліграфкамбінат імя Я. Коласа", 2005. – 416 с.

3. НАРБ.–Ф. 1386.–Воп. 1.–Спр. 22. Отчеты и политдонесения РК ЛКСМБ и помощников комиссаров по комсомолу о проделанной работе.

4. Фёдараў, І. Ім вярнулі дзяцінства / І. Фёдараў // Маладосць. – 1984. – № 4. – С. 154 – 157.

5. Лобанок, В.Е. В боях за Родину / В.Е. Лобанок. 3-е доп. издание. – Мн.: Беларусь, 1964. – 411 с.

6. НАРБ.–Ф. 1403.–Воп. 1.–Спр. 25. Разведданные, опросы перебежчиков, данные обороны и связи партизанской бригады им. Чапаева (Мельникова).

7. НАРБ.–Ф. 1391.–Воп. 1.–Спр. 120. Документы о признании деятельности подпольной патриотической группы «Бесстрашные» Полоцкого детдома (постановления, справки, подтверждения, заявления, личные листки, воспоминания, списки).

8. НАРБ.–Ф. 1405.–Воп. 1.–Спр. 959. Приказы и приказания штаба Особого соединения партизанских отрядов (ОСПО), партизанской бригады "Штурмовая" и приговора революционно-военного трибунала при п/б "Штурмовая".

9. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Заслаўя / Рэд.кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БЕЛТА, 2000. – 464 с.

10. Жива... Да, я жива! Минское гетто в воспоминаниях Майи Крапиной и Фриды Рейзман: материалы и документы / Сост. М.И. Крапина, Ф.В. Рейзман; отв. ред. К.И. Козак. – Мн., 2005. – 258 с.

А.М. ДУЛАЎ

## ГІСТОРЫЯ ВІЦЕБСКАГА ПАДПОЛЛЯ Ў ПРАЦАХ Н.І. ДАРАФЕЕНКІ

Падпольная барацьба супраць германскіх акупантаў ўяўляе сабой адну з найбольш складаных для вывучэння праблем гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны [1, с. 133]. Першыя публікацыі па дадзенай праблеме з'явіліся яшчэ ў ваенныя гады. Спрыяльныя ўмовы для даследавання антыфашысцкай барацьбы склаліся у так званы перыяд «адлігі». Важнае значэнне мела тое, што з 1956 г. на чале БССР стаялі былыя партызаны К.Т. Мазураў і П.М. Машэраў, якія падтрымлівалі даследаванні ў гэтай галіне [2, с. 134]. На пачатку 1960-х гг. у гістарычную навуку прыйшла Ніна Іванаўна Дарафеенка – удзельніца антыфашысцкага супраціўлення і даследчыца, справай жыцця якой стала адкрыццё праўды і ўшанаванне памяці пра подзвіг віцебскіх падпольшчыкаў. Мэта дадзенага артыкула: акрэсліць уклад Н.І. Дарафеенкі ў распрацоўку гісторыі віцебскага патрыятычнага падполля. Намі былі выкарыстаны біяграфічныя звесткі з энцыклапедыі і кніг "Памяць" [3; 4; 5], шчыры і цёплы

артыкул В. Шалухі, напісаны ў значнай ступені з уласных уражанняў аўтара ад супрацоўніцтва і сяброўства з гераіняй [6], аўдыёзапіс гутаркі з Нінай Іванаўнай, што адбылася 12 мая 2009 г. [7], а таксама асноўныя навуковыя работы даследчыцы (гл. спіс).

Ніна Іванаўна Дарафеенка, дзявочае прозвішча – Маісеева, нарадзілася 10 студзеня 1923 г. у вёсцы Уласава непадалёку ад Суража. Пасля заканчэння Суражскай беларускай школы Ніна Маісеева паступіла на хімічны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта, але ў хуткім часе вымушана была пакінуць універсітэт з-за ўвядзення платы за навучанне. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны Ніна закончыла шасцімесячныя курсы пры Віцебскім педагагічным інстытуце. Пасля вяртання ў родную вёску, Ніна Іванаўна ўключылася ў антыфашысцкі рух, стала ўдзельніцай падпольнай групы, а ў лістападзе 1942 г., разам са сваімі паплечніцамі, партызанкай брыгады «Аляксея».

У гады вайны Ніна Іванаўна страціла сям'ю: былі расстраляны гітлераўцамі дзве бабулі, дзядуля, маці і бацька, брацік і сястрычка. Двое дзядзькоў загінулі ў партызанах. Сама Ніна Іванаўна абмарозіла ногі. Ёй цудам удалося выжыць. Вярнулася дадому з хворымі нагамі і моцна сапсаваным зрокам. Пасля вызвалення Суражчыны, як толькі дазволіла здароўе, Ніна Маісеева пайшла працаваць настаўніцай. Ніна Іванаўна займалася і камсамольскай працай, была абрана другім сакратаром райкама камсамола. Адчуваючы недахоп ведаў, у 1946 г. яна стала студэнткай завочнага аддзялення гістарычнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута. Менавіта ў час вучобы ў Віцебску Ніна Іванаўна зрабіла першы крок да вывучэння падпольнай і партызанскай барацьбы. Па сённяшні дзень яна захоўвае нататнічак – падарунак ваеннага. Менавіта ў ім, бо цяжка было з паперай і сшыткамі, студэнтка-завочніца Ніна напісала першую кантрольную работу пра «свой бабий батальон». Работа атрымала станоўчую рэцэнзію. Сама Ніна Іванаўна лічыць яе першай спробай пяра [7].

Пасля заканчэння двух курсаў Віцебскага педінстытута Ніна Маісеева вырашыла паехаць вучыцца ў Молатаў (Перм), дзе жыў яе дзядзька. У 1949 г. пасля заканчэння гістарычнага факультэта Молатаўскага (Пермскага) педінстытута вярнулася на радзіму. Ніна Іванаўна працавала ў Віцебскім абласным аддзеле народнай адукацыі і ў аддзеле школ і ВНУ абкама КПБ. Тут яна сустрэла свайго будучага мужа, лётчыка-франтавіка, журналіста Мікалая Уладзіміравіча Дарафеенку, які працаваў загадчыкам сектара друку. Пасля нараджэння дачкі, не маючы магчымасці ездзіць у камандзіроўкі, Ніна Іванаўна Дарафеенка перайшла ў медыцынскі інстытут загадчыцай кабінета марксізму-ленінізму. У 1956 г., ужо будучы маці дваіх дзяцей, Н.І. Дарафеенка закончыла Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС [5]. Яна пачала працаваць выкладчыкам на палову стаўкі. Аднак вольнай стаўкі ў мединстытуце не было, і калі вызвалілася месца ў ВДПІ імя С.М. Кірава, Ніна Іванаўна перайшла туды. З 1962 па 1980 г. яна выкладала гісторыю партыі на матэматычным і біялагічным

факультэтах. Да сваёй працы Н.І. Дарафеенка падыходзіла творча, шчыра. з душою, была выкладчыцай строгай, але справядлівай, дзякуючы чаму карысталася аўтарытэтам і павагай як студэнтаў, так і калег.

За заслугі перад Радзімай Ніна Іванаўна ўзнагароджана медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За баявыя заслугі» і інш. У 1978 г. Н.І. Дарафеенкі было прысвоена званне «Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР». У 1994 г. рашэннем Камісіі пры Савеце Міністраў Ніне Іванаўне была прызначана пенсія за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь [5; 7].

Сферай навуковых інтарэсаў Ніны Іванаўны стаў антыфашысцкі рух супраціву. Даследаванне дадзенай тэмы яна лічыла і лічыць сваім асабістым абавязкам. Пасля прыходу ў ВДПІ імя С.М. Кірава Н.І. Дарафеенка пачала працу над кандыдацкай дысертацыяй, прысвечанай гісторыі віцебскага падполля. Каб абарона дысертацыі стала магчымай, павінна была завяршыцца работа па зацвярджэнні ЦК КПБ складу Віцебскага падполля. Ніна Іванаўна і Мікалай Уладзіміравіч Дарафеенкі ўвайшлі ў камісію абкама КПБ па вывучэнні і прызнанні Віцебскага падполля, якую ўзначальваў сакратар па прапагандзе, журналіст і гісторык Мікалай Ільіч Пахомаў. Менавіта яны выканалі асноўную работу па падрыхтоўцы даведкі, тэкст якой быў надрукаваны цалкам у газетах «Звязда» і «Советская Белоруссия» [8].

Евреи приняли активное участие и в деятельности Брестского комсомольско-молодежного подполья. Большая группа комсомольцев сплотилась вокруг П.Г. Жуликова. Среди них были Валя Зенкина, Цыля, Лев и Борис Пикусы.

В июле 1941 г. Цыля выписалась из больницы, где лечилась с братьями Левой и Борисом. Они втроем получили осколочные ранения в первый день войны от разорвавшейся бомбы в сквере имени Гоголя, а их мать Софья Михайловна Пикус погибла.

Поручения коммунистов молодежь охотно выполняла. После выхода из больницы Борис Пикус организовал вокруг себя группу юношей. До войны он работал в автохозяйстве слесарем. Это был смелый, общительный, энергичный комсомолец. Вскоре он стал одним из помощников П.Г. Жуликова [16].

Первое собрание комсомольского актива в августе 1941 г. проводил П.Г. Жуликов. На нем присутствовали В. Нестеренко. Н. Шошиц, Г. Банников, Б. Пикус, Л. Шейман, Е. Попова и др. Секретарем городской подпольной комсомольской организации, по предложению Жуликова, был избран В.А. Нестеренко, членами бюро – Г. Банников, Б. Пикус, Е. Попова, Л. Шейман.

К осени 1941 г. комсомольский актив города значительно расширился. Среди тех, кто включился в борьбу, был и Г. Меерович. Вместе с другими подпольщиками он выносил оружие из Брестской крепости. Летом 1942 г. Григорий Меерович легализовался.

В квартире у Пикусов был радиоприемник. Его искусно вмонтировали в стену, молодежь слушала и записывала сводки Совинформбюро, а дежурство вокруг дома в это время несли Цыля Пикус и Валя Зенкина.

Одной из первых потерь группы Б. Пикуса был Леонид Перевертайло. К Пикусам на ул. Листовского (ныне ул. Буденного) часто приходили Василий Нестеренко, Анатолий Жигимонт. Ваня Иванов, Калерия Меньшикова, Володя Горин, Саша Поляков, Борис Аношкин. Комсомольцы гетто, в прошлом учащиеся средней школы Михаил Фаерман, Изя Каган, Володя Эпштейн, работая на расчистке Брестской крепости, приносили к Пикусам части оружия, патроны. Работая в сарае, стоявшем за домом, организовали потайной склад. Комсомольцы гетто включились в спасение советских воинов: доставали для них медикаменты, одежду.

Руководители подполья подготовили план побега военнопленных, определили группу в 17 чел. и дату побега – 5 июня 1943 г. К его осуществлению привлекли Зою Соломоновну Прохорову и комсомолку Валю Зенкину (Сачковскую). Эта группа благополучно вышла из лагеря. Убрали часового, перерезали проволочные заграждения, выходили по одному. Немцы не сразу обнаружили диверсию, десять человек благополучно переплыли Мухавец, и, строго выполняя все указания подпольщиков, дошли до партизанских отрядов имени Чернака и Фрунзе.

Семь человек заблудились. Замаскировались в парке (ныне парк имени Иконникова), где пролежали весь день. Один из них, Петр Шибаев, пришел на квартиру подпольщицы Зои Соломоновны Прохоровой, которая жила по ул. Коммунистической, дом № 24. Зоя рано утром пришла к Кравцовым и сообщила, что ночью к ней пришел один из военнопленных. Она впустила его в сарай и накормила. Он просит пригласить к нему Веру Кравцову или Валю Зенкину. Посоветовались и решили сообщить о случившемся Г. Банникову. К Григорию пошла Варвара Иосифовна Кравцова.

Военнопленного переодели и переправили в безопасное место. Вечером 7 июня спасенного военнопленного с запасом еды провожали Валя Бубнова. Зоя Прохорова и Вера Кравцова до реки Мухавец, где его ждала лодка.

Из 32 учащихся 7«а» класса русской средней школы № 15 г. Бреста в комсомольском подполье боролись с нацистами 13 чел. Из них в неравной борьбе погибли Б. Аношкин, И. Коган, К. Милица, К. Романюк, В. Эпштейн. Ушли в партизаны В. Зенкина, Р. Рыкова, Ц. Пикус. Пропала без вести в 1943 г. П. Шалман.

В руки нацистов попали 14 членов разведывательной группы В.Я. Мельникова, в том числе он, сын Юрий, М.И. Плахт, П.В. Тарасов, Н.А. Романенко. Михаила Иосифовича Плахта арестовали ранним утром 10 октября 1943 г. Его много раз допрашивали и пытали, два раза семья смогла передать ему еду и теплую одежду. Одна из работниц тюрьмы рассказала его жене Александре Прокофьевне, что видела ее мужа в нижнем белье и остриженного: в таком виде, как правило, отправляли на расстрел.

14 февраля 1944 г. провокатор выдал подпольщицу Зою Соломоновну Прохорову, узнав, что она еврейка. Прохоровой еще в 1941 г. заменили документы. Изменили национальность, устроили работать на яйцебазу. У нее было четыре дочери. Двоих, средних по возрасту девочек – Людмилу и Тамару, определили в приют под фамилией Петровых. Старшая Нелли и маленькая Света оставались с матерью. Руководство подполья предлагало Зое Соломоновне уйти в партизаны, обещали забрать детей из приюта и переправить в партизанскую зону. Но она не решилась. Вместе с З.С. Прохоровой нацисты расстреляли и ее дочерей: 11-летнюю Нелли и 2-летнюю Светлану.

Одновременно по доносу провокатора арестовали подпольщицу Бэллу Вагенлейтнер. С шестилетней дочерью Нелей она была расстреляна. Сына Бэллы Александра спасли патриоты [17].

Межрайонный орган по руководству патриотической деятельностью нелегальных организаций, борьбой партизан и населения, названный комитетом борьбы с немецкими оккупантами, в июне 1942 г. принял решение о создании нелегальной типографии. С большим энтузиазмом в типографии работали И.Ш. Шерешевский, И.А. Хазан, М.С. Маргулис. Тексты листовок и обращений были написаны лично секретарем комитета И.П. Урбановичем или совместно с И.А. Хазаном [18].

Таким образом, евреи приняли активное участие в деятельности Брестского антифашистского подполья в 1941–1944 гг. К сожалению, почти все они погибли в смертельной схватке с ненавистным врагом за свободу и независимость нашей Родины.

1.Национальный архив Республики Беларусь (далее–НА РБ). Ф.4290. оп.2. Д.44.Л.1-4; д.71.Л.1-3.; ф.4. Оп.33 а. Д. 254. Л. 363.

2. Брест. Энц. справочник. Мн., 1987. – С. 363.

3. Гребенкина А.А. Брест непокоренный. Антифашистское подполье г. Бреста и Брестского района в годы Великой Отечественной войны (1941-1944). – Мн., 2005. – С.85.

4. Там же. С.87.

5. Там же, С.97.

6. Там же. С.107.

7. Иоффе Э.Г. По достоверным источникам. Евреи в истории городов Беларуси. – Мн., 2001. – С. 58.

8. Разянблат Я.С. Брэсцкае гета // Памяць. Брэст. У 2 кн. Кн. 2-я. – Мн., 2001. – С. 65.

9. Иоффе Э.Г. По достоверным источникам. – С. 58.

10. Разянблат Я.С. Брэсцкае гета. – С. 65.

11. Там же.

12. Там же.

13. Гребенкина А.А, Брест непокоренный. – С.129-130.

14. Там же. С.140.

15.Там же. С.85.

16. НА РБ.Ф.3682. Оп.1. Д.7. Л. 70.

17. Государственный архив Брестской области. Ф.7474 «П». Оп.1. Д,44, Л.7.

18. Подвиги их бессмертны. О подпольной борьбе советских людей в захваченных фашистскими оккупантами городах и селах Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1944) – Мн., 1978. – С. 339.

Д.А. КОЗЕЛ

# ДЕНЕЖНОЕ ДОВОЛЬСТВИЕ ЛИЧНОГО СОСТАВА ПАРТИЗАНСКИХ ФОРМИРОВАНИЙ В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

С первых дней войны Государственный Комитет Обороны и Советское правительство рядом законодательных актов определили правовое положение партизан. Прежде всего они были приравнены к военнослужащим Красной Армии. В Постановлении ГКО от 29 июля 1941 г. № 326с «О денежном обеспечении личного состава партизанских отрядов» говорилось: «Сохранить за личным составом партизанских отрядов среднюю заработную плату, как за добровольцами» [1, с. 17].

Постановлением ГКО № 1567с от 9 апреля 1942 г. рабочим и служащим (а также учащимся, получавшим стипендию), состоящим в партизанских отрядах, устанавливалось пособие в размере их среднего заработка (стипендии) по месту прежней работы. Семьям партизан, не имевших ко дню вступления в партизанские отряды заработка, выплачивалось пособие в соответствии с Указом Президиума Верховного Совета СССР от 26 июня 1941 г. «О порядке назначения и выплаты пособий семьям военнослужащих... в военное время». Это Постановление распространяло также на партизан и членов их семей законодательные акты, касающиеся их пенсионного обеспечения как военнослужащих [1, с. 20].

В период нахождения партизан в тылу противника с ними денежных расчетов лично не производилось, и в этом не было необходимости. Что касается их семей, находящихся в советском тылу или их самих при выходе из тыла противника, то в соответствии с инструкцией комиссариата финансов, народного комиссариата обороны и Центрального штаба партизанского движения от 15.08.42 г. № 001317с денежные расчеты производились следующим образом: рядовым партизанам из числа рабочих и служащих государственных предприятий и учреждений, кооперативных, общественных организаций и учащимся выплачивалось им самим или их семьям по доверенностям, лично или через военкоматы по месту жительства по соответствующим документам в следующих размерах: средний заработок – рабочим, основной оклад – служащим, стипендия – учащимся. Указанный расчет производился за фактическое нахождение в отряде, но не раньше, как с 1 апреля 1942 г. В том случае, когда на лиц из указанных категорий отсутствовали справки с места работы (учебы) о получаемом заработке (стипендии) на день вступления в партизанский отряд, денежный расчет производился следующим порядком: из числа рабочих и служащих – по 300 руб. в месяц, из числа учащихся, получавших стипендии, – по 100 руб. в месяц. При получении справок о заработке или стипендии делался соответствующий денежный перерасчет [2, с 2–11].

За период нахождения в партизанском отряде до 1-го апреля 1942 г. лицам указанных категорий денежный расчет производился той организацией или учреждением, где они находились до вступления в партизанский отряд.

Рядовым партизанам из числа не имеющих заработка ко дню вступления в партизанский отряд, а также из числа колхозников и лиц свободных профессий зарплаты или пособия не было положено. Семьям этих партизан (при наличии в семье нетрудоспособных), в соответствии с Указами ПВС СССР от 26 июня 1941 г. и от 19 июня 1942 г. назначалось пособие по месту их жительства как семьям красноармейцев и младших командиров РККА. Для назначения пособия указанным семьям по месту жительства, финотделом штаба высылался соответствующий материал в военкоматы [2, с. 2].

В соответствии с указанными в ст. 2 Инструкции ... в партизанских отрядах были установлены командные должности с определенными денежными месячными окладами, а именно:

командир, комиссар отряда – 750 руб.;

заместитель командира отряда, начальник штаба отряда, командир батальона – 600 руб.;

командир роты, командир взвода, командир самостоятельно действующей группы и соответственно политруки, помощник комиссара отряда по комсомолу – 500 руб.

За фактическое выполнение указанных должностей лица, как из числа военнослужащих, так и из числа гражданского населения, получали зарплату соответственно, независимо от категорий и принадлежности [2, с. 3].

В том случае, когда рядовые партизаны из указанных категорий прибывали из тыла противника по состоянию здоровья или в связи с ранением, им оказывалась единовременная денежная помощь до 500 руб.

Лицам из числа военнослужащих, вступившим в партизанские отряды из окружения или направленным из войсковых частей в тыл противника специально, сохранялся оклад, получаемый в войсках, даже если они занимали в партизанских отрядах должности рядовых партизан. В случаях, когда их армейский оклад денежного содержания необходимыми данными не подтверждался, выплата производилась им по воинскому званию. От младшего лейтенанта до капитана включительно и им соответствующим – 550 руб. в месяц; от майора до полковника включительно и им соответствующим – 750 руб. в месяц; по воинскому званию выше полковника – из расчета 1000 рублей в месяц. Что касается красноармейцев и младших командиров, то они в основном положенные деньги получали в финотделе штаба лично при выходе из тыла противника за весь период их нахождения в партизанах, так как минимальные их оклады (10 руб. в месяц) нецелесообразно было пересылать семьям [3, с. 13].

В феврале 1943 г. начальникам областных и республиканских штабов партизанского движения было направлено письмо за подписью начальника финансового отдела Центрального штаба, в котором разъяснялось:

«1. Партизаны, пропавшие без вести в период боевых действий и не явившиеся в партизанский отряд в течение 45 дней, исключаются из списков отряда приказом по штабу партизанского движения.

2. Семьи партизан, пропавших без вести в период боевых действий, имеют право на обеспечение пенсией наравне с семьями погибших» [4, с. 13].

В дальнейшем, с июня месяца 1943 г., был изменен порядок денежных расчетов рядовым партизанам из числа рабочих, служащих и учащихся. Зарплата (стипендия) стала сохраняться только тем лицам, которые вступили в партизанские отряды в течение трех месяцев со дня оккупации их местности (района) противником. Те лица, которые вступили в партизанские отряды по истечении трех месяцев со дня оккупации их местности, право на свой прежний заработок потеряли.

При назначении пособий в размере среднего заработка только тем партизанам из числа рабочих и служащих, которые вступили в партизанские отряды в течение трех месяцев со дня оккупации противником района их жительства, финансовый отдел штаба стал руководствоваться следующими сроками оккупации областей БССР немцами: Барановичская, Белостокская, Минская и Пинская области–1 июля 1941 г.; Вилейская и Витебская – 15 июля 1941 г.; Могилевская – 1 августа 1941 г.; Гомельская и Полесская области – с 1 сентября 1941 г. [5, с. 117].

Лицам из числа офицерского состава, вступившим в партизанские отряды по истечении трех месяцев со дня их окружения и занимающим в отрядах должности рядовых партизан, выплата получаемых окладов в войсках с сентября 1943 г. также была прекращена. В этом случае им выплачивалось по 10 рублей в месяц, кроме того, их семьи (при условии наличия в семье нетрудоспособных) имели право на получение безвозвратного пособия в военкоматах по месту жительства как семья офицерского состава [3, с. 13–14].

По мере развития партизанского движения шло укрупнение партизанских отрядов и их разрастание в бригады и соединения. Уже ко второй половине 1943 г. партизанских бригад и соединений по Беларуси насчитывалось до 150 единиц, не считая отдельно действующих отрядов. Чтобы увеличить число командных и начальствующих должностей в партизанских формированиях и определить им оклады денежного содержания, было принято специальное Постановление Совета Народных Комиссаров СССР от 19 октября 1943 г. за № 1139-348сс «О выплате денежного содержания командному составу партизанских отрядов». Согласно этому Постановлению с 1-го октября 1943 г. устанавливалась выплата денежного содержания лицам командного состава партизанских отрядов в размере средних окладов, которые они получали по последнему месту работы до вступления в партизанские отряды, но не менее размеров, указанных в прилагаемой схеме окладов.

| № п/п | Наименование должностей | Оклады денежного содержания | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Отряд численностью до 200 чел. | Отряд численностью от 201 до 350 чел. | Соединение отрядов от 351 до750 чел. | Соединение отрядов более 750 чел. |
| 11 | Командир, комиссар соединения | - | - | 1200-1400 | 1500-1800 |
| 22 | Зам. командира соединения | - | - | 900-1000 | 1100-1400 |
| 33 | Начальник штаба соединения | - | - | 900-1000 | 1100-1400 |
| 44 | Начальник службы соединения | - | - | 800-850 | 900-1200 |
| 55 | Командир, комиссар отряда | 750 | 800-950 | | |
| 66 | Заместитель командира отряда | - | 725-825 | | |
| 77 | Начальник штаба отряда | 675 | 725-825 | | |
| 88 | Начальник снабжения отряда | 650 | 700-800 | | |
| 99 | Врач отряда, старший военфельдшер | 650 | 650-750 | | |
| 110 | Командир, политрук подразделения (роты, взвода, группы) | 500-600 | 600-725 | 600-725 | 600-725 |

По указанным должностям оклады устанавливались приказом по штабу партизанского движения по каждому отряду, бригаде с учетом их численного состава и результатов их боевой деятельности [6, с. 33].

Во исполнение Постановления СНК СССР от 19 октября 1943 г. и приказа начальника Центрального ШПД от 21 октября 1943 г. приказами начальника Белорусского штаба были установлены оклады денежного содержания командному составу партизанских бригад и отрядов, действующих на территории БССР. В приложениях к приказам давалась краткая справка о численном составе и результатах боевой деятельности бригад и отрядов за период с 1 января по 1 октября 1943 г. [7, с. 140-149, 174-187, 196-227, 244-264, 265-271, 275-278, 279-286, 295-301, 309-339, 361-374].

К сожалению, в Постановление СНК СССР от 19.10.43 г. не был включен весь перечень должностей, фактически имевшийся в партизанских формированиях разного уровня. Должности командира или коменданта аэродрома, начальника и комиссара госпиталя бригады, оперуполномоченного отряда, секретаря партийной, комсомольской организации и другие были не предусмотрены и, следовательно, на них денежные расчеты распространялись как на рядовых партизан, что приводило к проявлениям недовольства с их стороны. Позже эта несправедливость была устранена приказом начальника Белорусского штаба партизанского движения от 11 августа 1944 г. [8, с. 98].

В случае гибели партизана причитающиеся ему деньги высылались семье почтой или через военкомат, а также высылались или выдавались на руки соответствующие документы для назначения пенсии по месту их жительства.

С началом освобождения Беларуси осенью 1943 г. началось соединение партизан с частями Красной Армии и выход их из тыла противника. Для встречи всех вышедших из тыла противника партизан в штабе был разработан соответствующий план мероприятий, согласно которому на витебском, западном, могилевском, гомельском и полесском направлениях были организованы группы ЦК КП(б)Б и БШПД [9, с. 9]. В составе каждой группы была предусмотрена должность старшего помощника начальника группы по финансированию, в задачу которого входило оформление соответствующих документов и проведение финансового расчета с каждым партизаном [9, с. 22].

В январе 1944 г. в связи с предстоящей передислокацией БШПД к линии фронта и сформированием Оперативных групп БШПД на Западном и Белорусском фронтах группы ЦК КП(б)Б и БШПД были расформированы, а функции по производству денежных расчетов с партизанами, выходящими из тыла противника, возлагались на Представительство Центрального и Белорусского ШПД на 1-м ПБФ и Оперативные группы штаба на Западном и Белорусском фронтах и непосредственно финансовый отдел Белорусского штаба [10, с. 4–5].

В связи с наступлением частей Красной Армии в Беларуси со второй половины июня 1944 г. началось массовое соединение партизан с частями Красной Армии. Для их встречи и проведения денежных расчетов на месте в каждую оперативную группу штаба (таких оперативных групп было создано семь) было включено один или два работника финотдела, были привлечены также финансовые работники фронтов и финансового управления Красной Армии. В среднем в день финансовым отделом приходилось рассчитывать до 1000 человек, расходуя для этого до трех миллионов рублей [3, с. 17-18].

Всего со дня организации штаба и до 1-го января 1945 г. финансовым отделом БШПД было израсходовано денежных средств (с учетом назначенных пособий и высланных денежных аттестатов семьям партизан)–157764700 руб. По состоянию на 1-е января 1945 г. через финансовый отдел прошло до двухсот тысяч партизан и членов их семей, дано 13000 ответов на полученные письма от семей партизан, военкоматов и других учреждений. До двадцати процентов партизан из числа тех, кому положен денежный расчет по состоянию на 1 января 1945 г., его по различным причинам еще не получили [3, с. 25–26].

Финансовый отдел ликвидационной группы БШПД в январе и в первой половине февраля 1945 г. продолжал в среднем в день по расчетам партизан расходовать по 60000 рублей [3, с. 27]. Выплаты денежного довольствия и пособий партизанам и их семьям продолжались вплоть до февраля 1948 г., так в последних двух денежных ведомостях от 3 февраля 1948 г. группе бывших партизан в количестве 70 чел. было выплачено денежное содержание и пособия на общую сумму 124992 руб. 35 коп. [11, с. 59–66].

Таким образом, несмотря на тяжелое положение в народном хозяйстве в годы войны руководством страны делалось все возможное для обеспечения народных мстителей наравне с военнослужащими действующей армии. В итоге руководство страны смогло максимально возможно обеспечить партизан и членов их семей средствами к существованию, социально их защитить.


1. Беларусь в постановлениях и распоряжениях Государственного Комитета Обороны СССР, 1941–1945 гг.: справочник / сост.: В.Д. Селеменев [и др.]. – Минск: НАРБ, 2008. – 216 с.

2. Инструкция комиссариата финансов, народного комиссариата обороны и Центрального штаба партизанского движения от 15.08.42 г. № 001317с // Национальный архив Республики Беларусь (НА РБ).– Фонд 1450.–Оп. 2.–Д. 151.

3. Отчет о финансовой деятельности БШПД за период: со дня организации и до 1 января 1945 года // Национальный Архив Республики Беларусь (НА РБ).–Ф. 1450.–Оп. 3.–Д. 89.

4. Письмо начальника ЦШПД № ФО/1059 от 15 февраля 1943 г. // Национальный архив Республики Беларусь (НА РБ).–Ф. 1450.–Оп. 2.–Д. 151.

5. Приказ начальника БШПД от 24.06.43 № 0021 // Национальный архив Республики Беларусь (НА РБ).–Ф. 1450.–Оп. 17.–Д. 5.

6. Приказ начальника ЦШПД от 21.10.43 № 0060 // Национальный архив Республики Беларусь (НА РБ).–Ф. 1450.–Оп. 18.–Д. 18.

7. Приказы начальника БШПД от 17.11.43 № 0035, от 04.12.43 № 0039, от 04.12.43 № 0040, от 04.12.43 № 0041, от 04.12.43 № 0042, от 04.12.43 № 0044 // Национальный архив Республики Беларусь (НА РБ).– Ф. 1450.–Оп. 17.–Д. 5.

8. Приказ начальника БШПД от 11.08.44 // Национальный архив Республики Беларусь (НА РБ). –Ф. 1450.–Оп. 18.–Д. 18.

9. План мероприятий по работе среди партизан, вышедших из тыла противника // Национальный архив Республики Беларусь (НА РБ).– Ф. 1450.–Оп. 1.–Д. 66.

10. Письмо заместителя начальника ЦШПД от 03.01.44 г. № фо/1/020 // Национальный архив Республики Беларусь (НА РБ).– Ф. 1450.– Оп. 18.–Д. 18.

11. Письмо начальнику финансового управления Министерства ВС СССР от 3.02.1948 г. // Национальный архив Республики Беларусь (НА РБ). - Фонд 1450. – Оп. 18. – Д. 24.



У.К. КОРШУК


## УЗАЕМААДНОСІНЫ ПАРТЫЗАН І МІРНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

У барацьбе супраць гітлераўцаў на тэрыторыі Беларусі ўдзельнічала практычна ўсё насельніцтва актыўнага ўзросту, пачынаючы са школьнікаў і

заканчваючы ўдзельнікамі грамадзянскай вайны. Пры гэтым найбольшую колькасць складалі людзі ад 17 да 35 гадоў. Практычна аднолькава (ад 20 да 30 %) былі прадстаўлены рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя. Большасць партызан Беларусі былі беспартыйнымі. Члены камуністычнай партыі, як правіла, знаходзіліся ў кіраўніцтве партызанскімі фарміраваннямі. У пачатку вайны ў барацьбу з ворагам найбольш актыўна ўступілі вайскоўцы, партыйныя і савецкія работнікі, а бліжэй да вызвалення – рабочыя і калгаснікі [1, с. 6].

Толькі пры актыўнай падтрымцы насельніцтва барацьба партызан магла быць паспяховай. З пачаткам вайны не ўсюды і не ўсе мясцовыя жыхары аднолькава прыхільна ставіліся да партызанскага руху. У сувязі з адступленнем Чырвонай Арміі, якое праходзіла неарганізавана, і наступленнем гітлераўцаў, у людзей была некаторая разгубленасць, страх. Частка насельніцтва Беларусі была збянтэжана, насцярожана. У некаторых былі і адмоўныя адносіны да партызан.

І ўсё ж у асноўнай большасці насельніцтва сяляне былі за Савецкую ўладу. Да таго ж, палітыка, якая праводзілася акупантамі, жорсткі рэжым, усталяваны на захопленай тэрыторыі Беларусі, садзейнічалі пашырэнню супраціўлення захопнікам. Нельга не адзначыць і адпаведнага ўплыву на насельніцтва работы з боку патрыётаў, якія тлумачылі мэты гітлераўцаў у вайне; задачы партызанскага руху ў барацьбе супраць захопнікаў. Пры гэтым усё больш рабілася акцэнтаў на нацыянальна-патрыятычных напрамках барацьбы з ворагам. У выніку ў большасці людзей на акупіраванай тэрыторыі змяняўся настрой, узнікала жаданне змагацца за вызваленне сваёй зямлі ад захопнікаў.

Змена настрою насельніцтва ад чакання і разгубленасці да нянавісці і жадання выгнаць ворага выяўлялася ў росце колькасці партызанскіх атрадаў, не выкананні сельскагаспадарчых паставак, зрыву мабілізацыі мясцовых жыхароў на работу ў Германію, у іншых актах пратэсту. Дапамога партызанам з боку насельніцтва аказвала і вялікі маральна-палітычны ўплыў. Узмацняючы баяздольнасць, яна падымала настрой партызан, аслабляла сілу ворага, яго маральны дух.

Мясцовыя жыхары пастаянна папаўнялі асабовы склад партызанскіх атрадаў, збіралі і перадавалі зброю і боепрыпасы, дапамагалі праводзіць баявыя аперацыі, вялі разведку, прымалі ўдзел у будаўніцтве абаронных збудаванняў і партызанскіх аэрадромаў. Сяляне забяспечвалі партызан харчамі, вопраткай і абуткам. Са свайго боку партызаны абаранялі мясцовае насельніцтва ад акупантаў, хавалі мясцовых жыхароў у партызанскіх зонах, дапамагалі ў сельскагаспадарчых работах, пры патрэбе аказвалі медыцынскую дапамогу. Менавіта падтрымка насельніцтва з'явілася адной з прычын шырокага разгортвання партызанскай барацьбы ў Беларусі. А насельніцтва ўсё актыўней уключалася ў барацьбу. Так, калі камандаванне Сіроцінскай партызанскай брыгады ў Віцебскай вобласці вырашыла вывесці са строю чыгуначную дарогу Полацк – Віцебск, было вырашана звярнуцца да насельніцтва, бо было малавата

сіл, не хапала ўзрыўчаткі. У выніку ў ноч з 29 на 30 жніўня 1942 г. разам з партызанамі мноства сялян з навакольных вёсак прымала ўдзел у гэтай аперацыі, якая стала адной з першых у Беларусі, накіраванай на разбурэнне чыгункі. У наладжванні такога ўзаемадзеяння важную ролю адыграў той факт, што камандзірам брыгады быў С.М. Кароткін, які да вайны працаваў у гарадскім пасёлку Шуміліна сакратаром райкома партыі. Мясцовыя жыхары яго добра ведалі, яму давяралі. Менавіта Кароткін на працягу 10 дзён пасля прыбыцця з-за лініі фронту стварыў тут партызанскую брыгаду колькасцю трыста чалавек і меў пастаянную падтрымку насельніцтва [2, с. 9].

Яшчэ ў час вайны савецкі пісьменнік А.С. Новікаў-Прыбой напісаў нарыс «Партызан Нікіта Шышко». Гэты чалавек перад вайной жыў у вёсцы Гасціно Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Нягледзячы на свае 82 гады, ён дапамагаў параненым вайскоўцам, збіраў зброю, якой узброіў сваіх двух сыноў і накіраваў іх у партызанскі атрад, а сам стаў сувязным партызан; збіраў для іх неабходныя звесткі. Затым ён перадаў партызанам 50 вінтовак, 2 ручных кулямёты, некалькі дзесяткаў гранат, 10 скрыняў патронаў. Пасля гэтага ён і сам пайшоў у партызаны.

За лініяй фронту, у савецкім тыле значную ўвагу надавалі падрыхтоўцы партызанскіх камандзіраў. Пры гэтым улічвалі, адкуль родам той, або іншы патрыёт, маючы на ўвазе яго падтрымку мясцовым насельніцтвам.

Так, у 1942 г. былога вясковага настаўніка Івана Коласа, ураджэнца вёскі Картынічы Лельчыцкага раёна, тады Палескай вобласці, пасля спецпадрыхтоўкі закінулі з самалёта на месца яго нараджэння. У выніку, са сваіх землякоў ён хутка арганізаваў Лельчыцкі партызанскі атрад, а затым брыгаду, якая вызваліла ад акупантаў значную тэрыторыю раёна. Партызаны разам з мясцовымі жыхарамі пабудавалі аэрадром. Пасля па даручэнню *БШПД* Колас дзейнічаў у Налібоцкай пушчы, змагаўся на тэрыторыі Польшчы. За мужнасць і адвагу наш зямляк атрымаў звязду Героя.

Баявыя дзеянні партызан Беларусі ў значнай ступені былі звязаны з пэўным раёнам. Атрады дзейнічалі ў асноўным на сваёй тэрыторыі, мелі свае населеныя пункты, якія забяспечвалі іх усім неабходным і знаходзіліся пад іх абаронай. Партызаны знішчалі гарнізоны і ў шэрагу выпадкаў трымалі ў сваіх руках цэлыя раёны. Так, Клічаўскі раён Магілёўскай вобласці вясной 1942 г. партызанамі цалкам быў вызвалены ад акупантаў. Партызаны заявілі, што тут аднаўляецца савецкая ўлада; кіраўніцтва ўсім жыццём перадаецца мясцовым Саветам. Пры гэтым уся дзейнасць мясцовай улады накіроўвалася на мабілізацыю працоўных на абарону Радзімы. Насельніцтва прызывалі збіраць зброю, ствараць прадуктовыя базы для харчавання партызан, аказваць дапамогу сем'ям чырвонаармейцаў, партызан, тым, хто пакутаваў ад захопнікаў. Дзеля аховы населеных пунктаў ад акупантаў ствараліся атрады самаабароны. З мэтай аказання дапамогі мясцовым органам улады ў правядзенні масава-палітычнай работы з мясцовых актывістаў былі створаны групы, якія замацоўваліся за

мясцовымі сельскімі Саветамі. Амаль два гады ўтрымлівалі ў сваіх руках партызаны Клічаўскі раён [3, с. 326].

Усяго на канец 1943 г. партызаны Беларусі кантралявалі 60 % акупіраванай тэрыторыі, дзе жыло амаль 4 млн. чал. Было створана больш 20 партызанскіх зон [3, с. 325]. Гэта былі тэрыторыі, вызваленыя партызанамі ад захопнікаў, якія ўтрымліваліся і кантраляваліся партызанамі. Акупанты імкнуліся вярнуць сабе гэтыя тэрыторыі, аднак партызаны зноў і зноў адбівалі іх у гітлераўцаў.

У склад партызанскіх зон уваходзіў увесь раён, альбо яго частка, ці некалькі раёнаў, населеныя пункты якіх былі вызвалены партызанамі. Тэрыторыя і колькасць партызанскіх зон на працягу вайны павялічвалася, яны рабіліся ўсё больш і больш падмуркам партызанскай барацьбы. Тут вялася работа па падрыхтоўцы партызанскіх рэзерваў, ствараліся новыя партызанскія атрады і дыверсійныя групы, сюды прыбывалі атрады з-за лініі фронту. Менавіта ў партызанскіх зонах пасланцы з Вялікай зямлі знаёміліся са становішчам у Беларусі, папаўнялі свае рады з мясцовых жыхароў. Пад аховай партызан у зонах жылі людзі, перасяляючыся туды часта цэлымі вёскамі. Толькі ў Клічаўскім раёне ў лясных лагерах знаходзілася больш 30 тыс. чал. [4, с. 151]. Насельніцтва дапамагала партызанам: папаўняла іх рады, збірала і рамантавала зброю і адзенне, даглядала параненых і хворых. Пры дапамозе партызан мясцовыя жыхары сеялі і збіралі ўраджай. У некаторых зонах працавалі школы. Тут размяшчаліся абласныя, міжраённыя і раённыя камітэты партыі, дзейнічалі органы савецкай улады; каардынавалася ўсё ваенна-палітычнае і гаспадарчае жыццё, падтрымлівалася ўстойлівая сувязь з Вялікай зямлёй.

У многіх раёнах дзейнічалі выканкамы Саветаў дэпутатаў працоўных. Але часцей ролю органаў савецкай улады выконвалі спецыяльна створаныя камендатуры, якія падтрымоўвалі парадак, вырашалі гаспадарчыя пытанні, арганізоўвалі групы самаабароны. Яны ахоўвалі населеныя пункты, рыхтавалі базы і лагеры для насельніцтва і партызан, паведамлялі аб набліжэнні праціўніка. Разам з партызанамі мясцовыя жыхары ўдзельнічалі ў абарончых работах: капалі акопы і траншэі, рыхтавалі абарончыя кропкі, удзельнічалі ў баях з ворагам. Прызначаны партызанамі камендант населенага пункта павінен быў арганізоўваць уначы дзяжурства і дзённае назіранне. Яго распараджэнні з'яўляліся абавязковымі для мясцовых жыхароў. Адначасова камендант павінен быў задавальняць патрэбы насельніцтва, забяспечваць яго добрыя ўзаемаадносіны з партызанамі. Дзейнасць камендантаў кантралявалася камандаваннем атрадаў, якія прызначалі на такія пасады найбольш правераных партызан. Акрамя прызначэння камендантаў, якія дзейнічалі ў партызанскіх зонах, у шэрагу выпадкаў партызаны выкарыстоўвалі старастаў, прызначаных немцамі ў вёсках блізкіх да іх гарнізонаў. Многія старасты фармальна з'яўляліся прадстаўнікамі ўлад, фактычна працавалі на карысць партызан.

Значная колькасць грамадзян Беларусі, не з'яўляючыся фармальна партызанамі, уносіла свой уклад у барацьбу з ворагам. Іх дапамога часта была

звязана з рызыкай, патрабавала ад людзей самаадданасці і мужнасці, з'яўлялася дзейнай формай удзелу ў народнай барацьбе супраць захопнікаў. Яны дастаўлялі партызанам разведдадзеныя, прымалі актыўны ўдзел у распаўсюджанні газет і ўлётак партызан, удзельнічалі ў правядзенні масава-палітычнай работы, уступалі ў рады партызан, каб са зброяй у руках змагацца з ворагам.

Адыграла важную ролю ва узаемаадносінах з насельніцтвам масава-палітычная работа партызан. Праводзіліся палітінфармацыі, бяседы, гучныя чысткі газет, распаўсюджваліся зводкі Саўінфармбюро, звесткі, якія перадаваліся па радыё. У 1943–1944 гг. амаль усе буйныя партызанскія фарміраванні мелі мастацкую самадзейнасць, гурткі і агітбрыгады, якія сістэматычна выступалі перад мясцовымі жыхарамі.

Падтрымка насельніцтва дазволіла партызанам сіламі буйных злучэнняў праводзіць шматкіламетровыя рэйды па тылам праціўніка. Партызаны грамілі варожыя гарнізоны і ваенна-стратэгічныя аб'екты ворага, знішчалі жывую сілу праціўніка. Мясцовыя жыхары ў ходзе гэтых рэйдаў не толькі падтрымоўвалі партызан, але многія ўступалі ў іх рады.

Важнае значэнне ва ўзаемаадносінах партызан з насельніцтвам мела аказанне мясцовым жыхарам медыцынскай дапамогі. Ва ўмовах акупацыі санітарны стан, здароўе людзей патрабавалі пэўнай увагі. У тыле ворага прыходзілася вырашаць пытанні медыцынскага абслугоўвання партызан і насельніцтва, ствараць медпункты. Знаходзіць урачоў і медработнікаў, неабходныя лекі. Медыцынскія кадры партызанскіх атрадаў фарміраваліся з ліку мясцовых медработнікаў і вайсковых урачоў, якія аказаліся ў акружэнні. Паспяховаму вырашэнню гэтай праблемы садзейнічала і дапамога партызанам з боку насельніцтва. У выніку большасць партызанскіх фарміраванняў стварылі свае шпіталі і медпункты. Яны мясціліся на базах брыгад у лясах, ці ў населеных пунктах, якія абаранялі партызаны.

У партызанскіх зонах з ліку партызан і мясцовых жыхароў вялася падрыхтоўка сярэдняга і малодшага медперсаналу. Жанчыны дапамагалі даглядаць параненых, мылі бялізну, перавязачныя матэрыялы. Насельніцтва дапамагала ў пошуку медыкаментаў. У гэтым значную ролю адыгралі тыя, хто працаваў у шпіталях і аптэках, якія былі падпарадкаваны акупантам. Так, прафесар Я.У. Клумаў, які працаваў у Мінскай гарадской бальніцы, дапамагаў параненым падпольшчыкам і партызанам, лячыў савецкіх патрыётаў, забяспечваў падпольшчыкаў і многія партызанскія атрады медыкаментамі, хірургічнымі інструментамі. З дапамогай Клумава поўнасцю былі абсталяваны два партызанскія шпіталі. У кастрычніку 1943 г. акупанты яго арыштавалі і разам з жонкай закатавалі. Пасмяротна Я.У. Клумаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза [5, с. 83].

Са стварэннем Беларускага штаба партызанскага руху некаторая колькасць лекаў паступала з Вялікай зямлі.

Значную ролю ва ўзаемаадносінах партызан з мірным насельніцтвам адыграла сумесная барацьба за захаванне жыцця дзяцей як будучыні беларускага народа.

Са 190 дзіцячых дамоў, якія існавалі ў Беларусі, звыш 100 засталіся на акупіраванай тэрыторыі. Акрамя таго акупацыйныя ўлады вымушаны былі стварыць звыш 20 прытулкаў [6, с. 6]. Жыццё дзяцей у гэтых установах у час акупацыі было трагічным. Не хапала ежы, адзення, выхаванцаў выкарыстоўвалі на розных работах, накіроўвалі на работы ў Германію, у многіх бралі кроў для нямецкіх салдат, праводзілі медыцынскія вопыты і інш. Толькі дзякуючы выхавальнікам, дапамозе мясцовага насельніцтва, партызан і падпольшчыкаў былі выратаваны жыцці многіх дзяцей.

У шэрагу выпадкаў партызаны і падпольшчыкі бралі пад свой кантроль дзейнасць дзіцячых устаноў, усімі магчымымі сродкамі дапамагалі дзецям. Былі выпадкі, калі партызаны вывозілі дзетдамы ў партызанскія зоны, каб выратаваць дзяцей ад пагрозы прымусовага вывазу ў Германію, праводзіць над дзецьмі медыцынскія вопыты, выкарыстоўваць іх у якасці донараў. Гэтых дзяцей стараліся ўладкоўваць у сем'і мясцовага насельніцтва. Быў выпадак і стварэння партызанскага дзетдома пры брыгадзе імя Чапаева ва Ушацкім раёне Віцебскай вобласці. Аднак пад пагрозай блакады з боку гітлераўцаў дзяцей вымушаны былі пераправіць у савецкі тыл. Пры падтрымцы насельніцтва партызаны ратавалі дзяцей: збіралі беспрытульных, перавозілі іх у больш бяспечныя вёскі, хавалі па лясах.

Сярод партызан, у сямейных лагерах знаходзілася калі 5,5 тыс. дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Многіх з іх стараліся пераправіць у савецкі тыл. Але значная частка дзяцей заставалася на акупіраванай тэрыторыі. Трэба было займацца арганізацыяй іх жыцця сярод партызан у партызанскіх зонах, выхоўваць іх. У выніку ў шэрагу вёсак з верасня 1942 г. пачалі працаваць партызанскія школы. Шырокае распаўсюджванне яны атрымалі у 1943 г. Гэта было выклікана не толькі неабходнасцю даваць дзецям адпаведныя веды, але і супрацьдзейнічаць палітыцы анямечвання, якую праводзілі акупанты сярод дзяцей. Акрамя школ, у населеных пунктах, якія кантраляваліся партызанамі, дзейнічалі «лясныя» школы. Яны знаходзіліся ў сямейных лагерах. Арганізоўвалася тайнае навучанне дома. Усё гэта давала магчымасць згуртаваць дзяцей, даваць ім адпаведныя веды, выхоўваць іх. Толькі разам з мясцовымі жыхарамі, у ўзаемадзеянні з насельніцтвам партызаны і падпольшчыкі маглі ажыццяўляць гэту работу, змагацца за будучае Айчыны.

1. Павлова, Е.Я. Личный состав партизанских формирований Беларуси в годы Великой Отечественной войны: источники и методы анализа / Е.Я. Павлова. Автореф. … дис. канд. ист. наук.– Минск, 2003.

2. Суслов, А. Была пора, была эпоха / А. Суслов. Сов. Белоруссия, 2009. 29 окт. С. 9.

3. Беларусь в годы Великой Отечественной войны. 1941—1945. Минск, 2005.

4. Пережогин, В.А. Партизаны и население (1941–1945 гг.) / В. А. Пережогин. Отечественная история. 1997. № 6.

5. Каваленя, А.А. Беларусь у выпрабаваннях вайны (1939–1945 гг.) / А.А. Каваленя. Мінск, 2001.

6. Паўлаў, У.П. Дзеці ліхалецця: дакументальныя нарысы / У.П. Паўлаў. Мінск, 2005.

С.П. КУБЕКА

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ НАРОДНАГА СУПРАЦІВУ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў АДЛЮСТРАВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КАЛЕКЦЫІ «АЛЕКСАНДРЫЙСКІЯ МІКРАФІЛЬМЫ»

Праблема партызанскай барацьбы супраць захопнікаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі сёння ўсё больш прыцягвае ўвагу беларускіх і замежных даследчыкаў. У апошні час у навуковы ўжытак уведзены новыя, раней малавядомыя ці невядомыя крыніцы. Архіўнымі ўстановамі краіны выдадзены шэраг дакументальных матэрыялаў і даведнікаў, мемуараў непасрэдных удзельнікаў партызанскага руху, шматлікія манаграфіі, у якіх робіцца спроба больш аб'ектыўна асэнсаваць гісторыю Беларусі ваеннага часу, дзейнасць партызанскіх фарміраванняў і падполля [1].

Не з'яўляюцца выключэннем у гэтым сэнсе і «Александрыйскія мікрафільмы» – мікракопіі нямецкіх трафейных дакументаў, арыгіналы якіх доўгі час захоўваліся ў г. Александрыя (ЗША).

Да пачатку 60-х гадоў служба архіўнага сэрвісу ЗША правяла працу па капіраванні трафейных дакументаў, іх тыражаванню, пасля чаго яны рознымі шляхамі з'явіліся ў архівах ФРГ і ГДР (Фрайбург і Патсдам), і іншых еўрапейскіх краін [2, с. 62].

У 60-я гады гэтыя дакументы пачалі трапляць у айчынныя архівы, колькасць якіх у 1980 г. дасягнула 279 мікрафільмаў. Восенню 2000 г. з архіваў КДБ атрымана апошнія 7. Такім чынам, нацыянальная калекцыя, якая сфарміравалася на сённяшні дзень, утрымлівае 286 мікрафільмаў [ 3]. Сярод арыгінальных крыніц, захаваных на стужках №№ 186, 187, 188, 192, 204, 213, 215, 217, 219, 223, 226, 247, 269, 272, 292, 294 і інш. значны аб'ём матэрыялаў займаюць дакументы германскай ваеннай і цывільнай адміністрацыі, кожная з якіх, выкарыстоўваючы розныя метады, асноўную ўвагу надавала барацьбе з партызанамі, пошуку ваенных, палітычных і іншых сродкаў утрымання сваёй улады на акупаванай тэрыторыі.

Асобнае месца займаюць матэрыялы, якія тычацца партызанскага руху на беларускай тэрыторыі, барацьбы партызан супраць ахоўных, паліцэйскіх і ваенных фарміраванняў. Гэта – даведкі аб партызанскай дзейнасці ў першыя месяцы вайны; аб дзеяннях партызанскіх атрадаў летам–восенню 1941 г.; дзённыя паведамленні аб партызанскіх аперацыях у раёнах розных абласцей Беларусі; дырэктыўныя дакументы, указанні і распараджэнні, памяткі і інструкцыі, тэлефонаграмы і радыёграмы, справаздачы, карты-схемы аперацый супраць партызан [4].

Самая вялікая колькасць матэрыялаў першакрыніцы аб дзейнасці партызанскіх атрадаў і груп адносіцца да 1942–1943 гг. У справаздачы 3-х груп ГФП за перыяд з 04. па 31.05. 1942 г. гаворыцца, што ў красавіку і маі амаль ва ўсіх месцах на тэрыторыі, якая ахоўваецца 203 ахоўнай брыгадай, назіралася актыўная партызанская дзейнасць. Тайная палявая паліцыя займалася амаль выключна барацьбой супраць партызан. Прафілактычная дзейнасць у часцы абарончых і контрмер, ахова чыгуначных ліній, харчовых і складоў паліва, а таксама іншых складоў адышла на другі план [5].

Трафейныя дакументы адлюстроўваюць прызнанне германскім кіраўніцтвам карэнных зменаў ваенна-палітычнай сітуацыі. Прычынамі з'яўляюцца, як адзначаюць акупацыйныя ўлады, разгортванне небывалай да гэтага часу наступальнай актыўнасці партызан, іх узрошая ўзброенасць артылерыйскімі гарматамі, мінамётамі, станкавымі кулямётамі, магчымасці вырашаць больш значныя задачы і праводзіць маштабныя аперацыі [6].

Для падцвярджэння вышэй згаданнага прывядзем вытрымкі з аднаго мікрафільма. Так, начальнік палявой паліцыі пры 203-й ахоўнай брыгадзе ў справаздачы ў штаб 2-й танкавай арміі ад 29.05.1942 г. нагадвае, што ў кіраўніцтве і арганізацыі партызанскага руху ў тыле 2-й танкавай арміі ў апошні час назіраецца значны ўздым, які неабходна разглядаць як усё больш сур'ёзную пагрозу для забеспячэння арміі [...]. Калі яшчэ некалькі тыдняў таму дзейнасць партызан у асноўным зводзілася да тэрарызавання насельніцтва, зрыву нашых адміністрацыйна-кіраўнічых і гаспадарчых мерапрыемстваў, да паралiку руху асобных нямецкіх аўтатранспартаў у шматлікіх раёнах, да дыверсій на дрэнна ахоўваемых чыгуначных участках, да ўхілення партызан пры любых абставінах ад баёў з нямецкімі часцямі, то ў сённяшні час трэба канстатаваць наступнае:

1. Важныя транспартныя магістралі ўсё больш становяцца мэтай сістэматычных партызанскіх удараў. Здзейсненныя ў апошні час неаднаразовыя налёты партызан на станцыі і населеныя пункты сведчаць аб тым, што праціўнік больш не сароміцца здзейсняць нападзенні на аб'екты і населеныя пункты, якія маюць значныя нямецкія гарнізоны.

2. Некаторыя партызанскія атрады, у большасці добра ўзброеныя аўтаматычным і цяжкім узбраеннем, колькасцю ў 60—80 чал. дзейнічаюць фактычна пад адзіным, добра падрыхтаваным камандаваннем. У сённяшні час, (са слоў пранямецкі настроеных жыхароў), буйныя партызанскія сілы рыхтуюць удар па гораду Трубчэўску. Гэтаму нападзенню мы маглі супрацьпаставіць

толькі ўзмацненне нашай агнявой моцы за кошт павелічэння трафейнай зброі. Чакаемая страта горада Трубчэўска з яго вялізарнымі запасамі зерня і жывёлы наносіць не толькі вялікі гаспадарчы ўрон, але і з'явіцца сур'ёзнай пагрозай для жыццёва важнай чыгуначнай магістралі Гомель—Бранск.

3. Банды і іх штабы ў асноўным знаходзяцца ў баку ад буйных населеных пунктаў, ва ўмацаваных і добра абсталяваных і ахоўваемых бункерах, якімі нельга авалодаць, не маючы цяжкай зброі.

Рускаму насельніцтву пад пагрозай смерці забаронена з'яўляцца ў гэтых раёнах. Супраць мясцовага насельніцтва, якое дапамагае партызанам, не аказвае ім супраціўленне ці перадае звесткі аб нашых войсках, выкарыстоўваюцца самыя жорскія меры. Добра арганізаваная разведслужба дазваляе партызанам валодаць інфармацыяй аб усіх падзеях, якія адбываюцца на нямецкім баку [7].

Акрамя гэтага дакументы «Александрыйскія мікрафільмы» утрымліваюць: дакладныя фюрэру аб выніках правядзення карных аперацый супраць партызан і мясцовага насельніцтва; вынікі і страты ў ходзе правядзення такіх аперацый у 1942 г. [8]; загад рэйхсфюрэра СС і начальніка штаба злучэнняў па барацьбе супраць партызан ад 28.10.1943 г. аб наступленні 1.11.1943 г. на (*як яны нагадваюць*) партызанскую рэспубліку Расоны, карты-схемы партызанскіх сіл у раёне; дакументы аб партызанскай дзейнасці за розныя месяцы ў тыле армій «Цэнтр»" [9]; прылажэнні да дзённіка баявых дзеянняў разведаддзела 2-й танкавай арміі за студзень–май 1943г.; за ліпень–кастрычнік 1943 г. Тут знаходзяцца дакладныя аб развіцці партызанскай сітуацыі за лета 1943 г.; *карты–схемы размяшчэння партызанскіх атрадаў і брыгад на 31. 08. 1943 г.* У дакументах апісваецца зараджэнне і развіццё партызанскага руху, партызанскія акцыі і г.д. [10].

Цікавасць прадстаўляе карта–схема аб колькасці партызанскіх атрадаў па абласцям на 17.04.1943 г.:

*Віцебск–150 атрадаў, 22 160 чал. Вілейка–18 атрадаў, 2 254 чал.*
*Магілёў–77 атрадаў, 7 162 чал. Мінск–115 атрадаў, 15 858 чал.*
*Мазыр–40 атрадаў, 4 599 чал. Гомель–33 атрады, 3 403 чал.*
*Пінск–24 атрады, 4 322 чал. Баранавічы–45 атрадаў, 6 152 чал.*
*Брэст–18 атрадаў, 2 564 чал. Беласток–2 атрады, 20 чал.* [11].

Першакрыніца ўтрымлівае дакументы аб развіцці партызанскага руху на Беларусі ў 1944 г.. Сюды адносяцца: баявыя данясенні 201-й ахоўнай дывізіі аб ходзе і выніках карных аперацый, іх карты -схемы; статыстычныя дадзеныя аб нападзеннях партызан на нямецкія фарміраванні за розныя месяцы 1944 г.; карты-агляды партызанскай дзейнасці ў розных абласцях Беларусі; агляд узброенных сутыкненняў за люты 1944г., калі адбылося 319 баёў з партызанамі, 349 нападаў на войскі, 473 дыверсій на чыгунцы толькі ў Віцебскай вобласці. У дакументах адзначаецца, што трэба разлічваць на абвастрэнне партызанскай дзейнасці, асабліва на чыгуначнай лініі Маладзечна–Полацк. Дакументы ўтрымліваюць таксама карты размяшчэння партызанскіх сіл на 1.04.1944 г.; том прылажэнняў № 8 да ДБД 3-й танкавай арміі за сакавік – май 1944 г.; дакладную

запіску аб вопыце барацьбы супраць партызан у тыле 9-й арміі; пералік партызанскіх атрадаў на Беларусі па становішчы на 31 сакавіка 1944 г.; дзённыя паведамленні за красавік аб дыверсіях на чыгуначных лініях Віцебшчыны [12].

Такім чынам, відавочна, што нават кароткі агляд «Александрыйскіх мікрафільмаў»" паказвае значнасць першакрыніцы ў вывучэнні праблем партызанскага руху на Беларусі ў часы вайны, адносін да яго з боку акупацыйных улад. А стварэнне археаграфічнага рэестра матэрыялаў дасць магчымасць больш аб'ектыўнага даследавання ваеннай гісторыі Беларусі.


1. Літвін А. Да пытання распрацоўкі праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гадоў. 55 гадоў Перамогі у Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз гады, новая канцэпцыя і падыходы. Матер. навук. –тэарыт. канф. 4–5 мая 2000 г. –Мінск, 2000. – С. 119–125. Ч.1. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гісторыяграфіі і крыніцазнаўства: Зб. дакументаў.– Мінск, 1999. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Док. и материалы. В 3 т. – Минск, 1983–1985. Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Ю. Туронак. – Мінск, 1993.
2. Новікаў С. «Александрыйскія мікрафільмы» як новая архіўная першакрыніца ваеннай гісторыі Беларусі // Вести ИСЗ. 2000. №2. – С. 62.
3. НА РБ. МФ. 1—286.
4. НА РБ. МФ. 151, 152, 153, 263, 264, 212, 219, 273, 277.
5. НА РБ. МФ 216. К. 000222.
6. НА РБ. МФ. 286. К.000615 – 000616.
7. НА РБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1006. Л. 281.
8. НА РБ. МФ. 215.
9. НА РБ. МФ. 112, 115, 117, 121, 128.
10. НА РБ. МФ. 130, 171, 187, 189, 275, 191, 149.
11. НА РБ. МФ. 190, 191, 276, 193.
12. НА РБ. Ф. 4683. Воп. 3. С. 991. Л. 26.
13. НА РБ. МФ. 197, 198, 199, 194, 175, 196, 195.



А.Н. МАКСИМЧИК


## НАРОДЫ КАВКАЗА В ПАРТИЗАНСКОМ И ПОДПОЛЬНОМ ДВИЖЕНИИ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ

На первый взгляд, может показаться, что история белорусского народа и народов Кавказа имеет больше различий, чем сходства. Заглядывая в зеркало истории, нельзя не заметить одно очень важное сходство, объединяющее эти народы – геополитическое положение территории, которое находится в зоне цивилизационного раскола. Это позволяло использовать ее в качестве арены

столкновения враждующих сторон. Пограничный статус территории сформировал и соответствующую стратегию сопротивления агрессии извне.

